- Кулагін, А.М. Дом віцэ-адміністратара / А.М. Кулагін // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 172.
- Малая краязнаўчая энцыклапедыя. Гарадніца // Краязнаўчая газета. - 2007. - № 27. - С. 8.



- Трусов, И. Театральная площадь / И. Трусов // Вечерний Гродно. - 2007. - 15 авг. - С. 27.
- Трусов, И. Побег на Городницу / И. Трусов // Вечерний Гродно. - 2008. - 23 крас. - С. 31.
- Трусов, И. Знакомьтесь, Городница / И. Трусов // Вечерний Гродно. - 2008. - 5 нояб. - С. 25.
- Трусов, И. Знакомьтесь, Городница / И. Трусов // Вечерний Гродно. - 2008. - 19 нояб. - С. 33.
- Трусов, И. Король против гения / И. Трусов // Вечерний Гродно. - 2008. - 24 дек. - С. 38.
- Трусов, И. Между землей и небом : призраки Городницы / И. Трусов // Вечерний Гродно. - 2009. - 25 крас. - С. 12.
- Гарадніца // Краязнаўчая газета. - 2007. - № 27 (ліп.). - С. 8.
- Трусов, И. Воздух Городницы / И. Трусов // Вечерний Гродно. - 2009. -22 крас. - С. 12.
- Трусов, И. Воздух Городницы / И. Трусов // Вечерний Гродно. - 2009. - 6 мая. - С. 10.
- Трусов, И. "Рыцари" Городницы / И. Трусов // Вечерний Гродно. - 2009. - 10 июня (№23). - С. 30.
- Трусов, И. Призраки Городницы / И. Трусов // Вечерний Гродно. - 2009. - 18 февр. - С. 30.

# Гродзенскі дом віцэ-губернатара

Помнік архітэктуры класіцызму. Пабудаваны ў Гродне (суч. вул. Э. Ажэшкі, 3) на мяжы XVIII - XIX ст. (каля 1800 г.) для гродзенскага віцэ-губернатара Максімовіча. У 1920-я выкарыстоўваўся Гродзенскім старостам. 2-павярховы Г-падобны ў плане мураваны будынак накрыты 2-схільным дахам. Сіметрыя галоўнага фасада падкрэслена 4-калонным порцікам дарычнага ордэра з трохвугольным франтонам. Бакавыя часткі вылучаны рызалітамі, якія выступаюць за межы верхняга карніза. Унізе 3 паўцыркульныя праезды. 1-ы паверх аддзелены ад астатніх 2 гарызантальнымі цягамі. Фасад раскрапаваны філёнгамі, рустам, завершаны развітым прафіляваным карнізам. Прамавугольныя аконныя праёмы аздоблены фігурнымі ліштвамі і сандрыкамі. Планіроўка калідорная з 2-баковым размяшчэннем памяшканняў. Пры галоўным уваходзе вялікі вестыбюль з парадней лесвіцай. Інтэр'еры былі ўпрыгожаны фрэскавай размалёўкай. У невялікім садзе за домам стаяла каменная альтанка-ратонда ў стылі класіцызму (не збераглася). Выкарыстоўваецца як адміністрацыйны будынак. Помнік рэсп. значэння.

**Бібліяграфія**


- Багласаў, С.Г. Забудова вуліцы Ажэшка. Дом віцэ-губернатара / С.Г.Багласаў, А.Ю. Пятросава, Э.М. Савіцкі, Т.І. Чарняўская // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 55.
- Гродзенскі дом віцэ-адміністратара // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш – Мінск, 1997. - Т. 5. – С. 431.
- Гродненский дом вице-губернатора // Туристская энциклопедия Беларуси. – Минск, 2007. – С. 157.
- Кулагін, А.М. Гродзенскі дом віцэ-губернатара / А.М. Кулагін // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 172.
- Кулагін, А.М. Гродзенскі дом віцэ-губернатара / А.М. Кулагін // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 189.


# Гродзенскі дом лясной адміністрацыі

Помнік грамадзянскай архітэктуры XVIII ст. Пабудаваны ў Гродне (суч. вул. Леніна, 4б) у 1760 – 80 гг. у стылі барока. Уваходзіў у архітэктурны комплекс Гарадніцы. Мураваны 2-павярховы прамавугольны ў плане будынак. Вальмавы дах з мансардамі на тарцовых фасадах з'яўляецца асноўным элементам кампазіцыі. 1-ы паверх аддзелены ад другога гарызантальным пояском.



Цэнтральныя часткі падоўжаных фасадаў вылучаны рызалітамі. Вокны прамавугольныя, завяршальны карніз прафіляваны, з невялікім вынасам. Унутраная планіроўка калідорная, пакоі размешчаны па перыметры будынка. Выкарыстоўваецца як жылы.

Помнік рэспубліканскага значэння.

**Бібліяграфія**


- Гродненский дом лесной администрации // Туристская энциклопедия Беларуси. – Минск, 2007. – С. 157.
- Мельнік, І.С. Гродзенскі дом лясной адміністрацыі / І.С. Мельнік Архітэктура Беларусі: энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 172.
- Мельнік, І.С. Дом лясной адміністрацыі / І.С. Мельнік // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 53.


## Гродзенскі дом Элізы Ажэшка

Дом-музей Элізы Ажэшка быў пабудаваны ў XVIII ст. па праекце архітэктара І.Мёзера, у 1894 – 1910 гг. тут жыла пісьменніца. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў разбураны, адноўлены – ў 1954 г. У доме знаходзіцца юнацкі філіял Гродзенскай абласной бібліятэкі ім. Я.Ф.Карскага і мемарыяльны пакой (адчынены ў 2001 г.; 34, 3 м. кв.) прысвечаны жыццю і творчасці Ажэшкі. У чытальнай зале бібліятэкі размешчана экспазіцыя (277 экспанатаў і 55 фатаграфій). Сярод экспанатаў кнігі, рукапісы, прыжыццёвыя выданні пісьменніцы, з гербарыі, сабраныя Э.Ажэшка, яе партрэт, напісаны пры жыцці, мэбля, камін.



Тут Ажэшка напісала кнігу апавяданняў “Меланхолікі”, аповесці “Аўстраліец” і “Ad astra”, раман “Арганаўты” і інш. З 2001 г. у музеі адкрыты салон “У пані Элізы Ажэшка”.

**Бібліяграфія**


- Аляксееў, Л.В. Дом Элізы Ажэшкі / Л.В. Аляксееў // Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі Панямоння / Л.В. Аляксееў. – Мінск, 1996. – С. 58.
- Гродненский дом Элизы Ожешко // Туристская энциклопедия Беларуси / редкол.: Г.П. Пашков [и др.]; под общ. ред. И.И.Пирожника. – Мінск, 2007. – С. 157.
- Забудова вуліцы Ажэшка.Дом-музей Э. Ажэшка / С.Г.Багласаў, А.Ю. Пятросава, Э.М. Савіцкі, Т.І. Чарняўская // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 56.

- Казбярук, У. Беларускія перастварэнні Элізы Ажэшкі / У. Казбярук // Роднае слова. - 2003. - № 8. - С. 15 - 16.
- Масляніцына, І. Жанчыны ў гісторыі Беларусі / І. Масляніцына // Беларускі гістарычны часопіс. - 2005. - № 1. - С.45 – 47.
- Чэмер, М. Фотасляды на сцежках Міцкевіча і Ажэшкі / М.Чэмер // Настаўніцкая газета. - 2005. - 17 лістап. - С. 4.
- Семкина, С. Бедная Элиза / С.Семкина // Белорусская нива. - 2006. - № 49 - 50, 4 марта. - С. 14.
- Романчук, Р. Возвращение к Элизе / Р.Романчук // Вечерний Гродно. - 2006. - 22 сак. - С. 8.
- Бутэвіч, Ан. Прыемнасць адкрыцця / Ан. Бутэвіч // Звязда. - 2006. - 6 чэрв. - С. 3.
- Рутова, М. "Над Неманом" в картинах и фотографиях / М.Рутова // Вечерний Гродно. - 2007. - 23 мая. - С. 32.
- Ветров, А. Родная земля Элизы Ожешко / А. Ветров // Милицейский вестник. - 2007. - 24 мая. - С. 5.
- Вілорава, М. Сцяжынкамі Элізы Ажэшка / М. Вілорава // Гродзенская праўда. - 2007. - 24 мая. - С. 8.
- Ивановский, В. Места, озарённые талантом Элизы / В. Ивановский // Перспектива. - 2007. - № 43. - С. 17.
- Пракопчык, Б. "Стары дом з трох бакоў быў акружаны садам..." / Б. Пракопчык // Звязда. - 2007. - 10 чэрв. - С. 4.
- Никитина, Т. Последний приют под крестами / Т. Никитина // Обозреватель. - 2007. - 22 июня. - С. 8.
- Томчык, У. Тут след Ажэшкі незамглены... / У.Томчык // Гродзенская праўда. - 2007. - 2 жн. - С. 5.
- Гринкевич, Т. Тадеуш и Элиза / Т. Гостилович // Беларусь сегодня. - 2007. - 4 верас. - С. 13.
- Гамина, В. Возвращение к Элизе / В. Гамина // Перспектива. - 2007. - 9 нояб. - С. 3.
- Козлович, В. Тайны склепа / В. Козлович // Беларусь сегодня. - 2008. - 18 марта. - С. 4.

- Чирков, М. Музей Элизы Ожешко закрывают на ремонт / М.Чирков // Вечерний Гродно. - 2008. - 16 апр. - С. 8.
- Навумовіч, У. Прыцягальная сіла класікі / У.Навумовіч // Роднае слова. - 2008. - № 12. - С. 6 - 7.
- Гостилович, Т. Миллиард для дома Э.Ожешко / Т. Гостилович // Гродзенская праўда. - 2008. - 5 крас. - С. 1.
- Ивановский, В. Память на все времена / В. Ивановский // Перспектива. - 2008. - 1 мая. - С. 27.
- Ивановский, В. Память на все времена / В. Ивановский // Перспектива. - 2008. - 8 мая. - С. 28.
- Загідуліна, М. Любімая гродзенцамі / М. Загідуліна // Гродзенская праўда. - 2009. - 17 кастр. - С. 5.
- Зданович, А. Над Неманом, где веет вдохновеньем / А. Зданович // Гродзенская праўда. - 2009. - 11 ліп. - С. 5.
- Клещенок, Т. Дом пани Элизы / Т. Клещенок // Гродзенская праўда. - 2009. - 2 вер. - С. 11.
- Місюкевіч, А. Была б удзячна Элаіза / А. Місюкевіч // Перспектива. - 2009. - 25 сак. - С. 2.
- Мусіенка, С. Гродна ў жыцці і творчасці Элізы Ажэшкі і Зоф'і Налкоўскай : да праблемы пераемнасці традыцый / С. Мусіенка // Роднае слова. - 2009. - № 8. - С. 20-25.
- Черкес, Н. Долина слез / Н.Черкес // Перспектива. - 2009. - 29 июля. - С. 29.
- Шніп, В. Балада Элізы Ажэшкі / В. Шніп // Маладосць. - 2010. - № 3. - С. 45.
- Шунейка, Я. Кветкавы мадэрн / Я.Шунейка // Мастацтва. - 2006. - № 5. - С. 24 – 25.
- Горшкова, К. Ожешко в будущем мире // Перспектива. - 2010. - 19 мая.- С. 5.
- Зданович, А. Над Неманом // Гродзенская праўда. - 2010. - 19 мая. - С. 3.
- Хмяльніцкі, М. GLORIA VICTIS. Паўстанне 1863-1864 гг. У жыцці і творчасці Элізы Ажэшкі. - 2010. - №5. - С. 27 - 30.
- Ажэшка Э. (1841-1910) – 6 чэрвеня 170 гадоў з дня нараджэння польскай пісьменніцы// Новыя кнігі. - 2011. - № 3. - С. 14 - 16.
- Ігнатовіч, М. У госці да пані Элізы : [пра мемарыяльны пакой Элізы Ажэшкі ў памяшканні ГАНБ ім. Я.Ф.Карскага] // Літаратура і мастацтва. - 2011. - 8 ліп. - С. 22.
- Чарнякевіч, Ю. Як наведаць Элізу Ажэшку? : [аб памятных мясцінах, звязаных з жыццем пісьменніцы] // Туризм и отдых. - 2012. – 15 марта. - С. 10.
- Саяпин, В. Судьба дома Ожешко : [История Дома-музея писательницы в Гродно] // Вечерний Гродно. - 2012. - 22 авг. - С. 29.

- Антонова, А. По улицам с Ожешко : [о выставке фотографий "Гродно и гродненцы времен Э. Ожешко" в отделе искусства ГОНБ им. Е.Карского] // Гродзенская праўда. - 2012. - 22 снеж. - С. 3.

## Гродзенскі “домік майстра”



Помнік архітэктуры барока. Пабудаваны ў 1768 – 73 гг. ў Гродне на тэрыторыі Гарадніцы (суч. вул. Ажэшкі, 37). З’яўляецца адзіным уцалелым будынкам з 20 т. зв. “Басняцкіх дамоў” (“баснякі” – вайсковая варта Гродзенскай каралеўскай эканоміі), узведзеных па двух тыпавых праектах архітэктара І.Г. Мёзера сіметрычна абапал вул. Раскоша (суч. Ажэшкі) для жылля запрошаных на мануфактуры А.Тызенгаўза замежных майстроў і “баснякоў”. Домік – прыклад першай на Беларусі тыповай жылой забудовы. Мае мураваную фасадную сцяну з сіметрычна размешчанымі невялікімі вокнамі 1-га паверха і акном мансарды. Франтон складанай канструкцыі накрыты дахоўкай. Фасад падзелены накрытым дахоўкай карнізам. Да фасаднай сцяны прыбудаваны асноўны драўляны аб’ём. 2-схільны дах з мансардай накрыты дахоўкай. На 1-м паверсе будынка жылы пакой, кухня і сені, з якіх лесвіца вядзе на мансарду. Гродзенскія “басняцкія дамы” паводле праектнага вырашэння блізкія да пастаўскіх і шаўляйскіх, але некалькі меньшыя і працейшыя па дэкоры і планіроўцы. У 1987 г. распрацаваны праект рэстаўрацыі будынка (арх. У.Барсукоў, аўтар гіст. даследавання В. Калнін ). Праект рэалізаваны ў 1990 г. Зараз у будынку размяшчаецца Дом рамёстваў. Помнік рэспубліканскага значэння.

**Бібліяграфія**


- Багласаў, С.Г. Забудова вуліцы Ажэшка. Дом №37 / С.Г. Багласаў, А.Ю. Пятросава, Э.М. Савіцкі, Т.І. Чарняўская // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 56.
- Раманава, З.П. Гродзенскі “домік майстра” / З.П. Раманава // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 172.

- Зубрицкая, М. Волшебная сила соломки / М. Зубрицкая // Милицейский вестник. - 2009. - 30 апр. - С. 22.
- Зубрыцкая, М. Карануе сонцам залатую ніву / М. Зубрыцкая // Перспектива. - 2006. - № 52. - С. 22.
- Зубрыцкая, М. "І тчэ забыўшыся рука..." / М. Зубрыцкая // Перспектива. - 2006. - 27 июня. - С. 6.
- Зубрыцкая, М. Сталі лаўрэатамі / М.Зубрыцкая // Перспектива. - 2006. - 6 апр. - С. 5.
- Зубрыцкая, М. "Умелыя матчыны рукі - прыгожы, утульны дом" / М. Зубрыцкая // Перспектива. - 2006. - 4 мая. - С. 21.
- Выдзьмушкі ў стылі выцінанкі // Культура. - 2006. – 22 - 28 крас. - С. 12.
- Лей, А. Выставка в Городничанке / А. Лей // Перспектива. - 2007. - 4 дек. - С. 1.

## Гродзенскі касцёл і кляштар бернардынцаў

Помнік архітэктуры XVI - XVIII ст. у якім спалучаюцца прыёмы і формы готыкі, рэнесансу і барока. Драўляны кляштар заснаваны ў 1494 (фундатар Аляксандр Ягелончык). Будаўніцтва мураванага касцёла пачалося ў 1602 г. Вуглавы камень у падмурак быў закладзены епіскапам віленскім Бенедыктам Война. Касцёл пад назвай Адшукання Св. Крыжа быў асвячоны 13.5.1618 г. епіскапам Еўстахіем Валовічам. У 1656 г. будынкі касцёла і кляштара моцна пашкоджаны пажарам. У 1680 г. перакрыта страха касцёла, рэстаўраваны алтар Св. Антонія, пабудавана капліца Св. Барбары. У 1736 г. па ініцыятыве гвардыяна Францішка Бараноўскага будуецца тры алтары капліцы Св. Міхаіла. У гэты час перабудаваны алтары Св. Міхаіла, св. Банавентуры, Св. Ануфрыя, Св. Пятра з Алькантары. У 1738 г. праведзена рэстаўрацыя званіцы. У 1853 г. Гродзенскі кляштар бернардзінцаў ліквідаваны. Уключае касцёл, жылы корпус, вежу-званіцу, якія звязаны ў адзін комплекс і ўтвараюць замкнёны ўнутраны двор. Размешчаны на высокім правым беразе Немана, з’яўляецца дамінантай сілуэта забудовы цэнтра горада. Касцёл – 3-нефавая 6-стаўповая базіліка з моцна выступаючай і паніжанай адносна цэнтральнага нефа паўцыркульнай апсідай, з прытворам і 2 капітэлямі. Цэнтральны неф накрыты двухсхільнымі дахамі. У архітэктуры касцёла спалучаюцца стылявыя элементы готыкі (стральчатыя праёмы і ступеньчатыя контрафорсы апсіды, нервюры скляпенняў), рэнесансу і барока (дынамічная групоўка ордэрных форм на галоўным фасадзе і крывалінейны сілуэт верхняга яруса). Галоўны фасад дэкарыраваны развітым антаблементам, пілястрамі карынфскага ордэра, арачнымі нішамі і завершаны трохвугольным франтонам. Сцены бакавых фасадаў члянёны пілястрамі і спаранымі арачнымі вокнамі. Цэнтральны неф аддзелены ад бакавых 6 апорныім слупамі. Нефы

перакрыты крыжовымі скляпеннямі. У 1788 г. аздоба інтэр’ера дапоўнена жывапісам (маст. А. Грушэцкі і Ф. Міхалкевіч), разьбой па дрэве, чугунным і бронзавым ліццём, стукавым арнаментам, скульптурай. Скляпенні крыжовыя на падпружных арках, размаляваных у тэхніцы грызайль (гербы заказчыкаў, раслінны арнамент). Плафоны з фрэскавымі кампазіцыямі. У нішах аркатурнага пояса на паўднёвай сцяне цэнтральнага нефа выявы 12 апосталаў, на поўначы – 12 дзеячаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Кампазіцыя “Ушэсце Хрыста” размешчана на тымпане арачнага перакрыцця цэнтральнага нефа. Каля паўночнага нефа – амбон у стылі класіцызму, дэкарыраваны лісцем аканту і авальнымі медальёнамі з выявамі евангелістаў (дрэва, накладная разьба). Дзверы і сцены прытвора, што выходзяць у цэнтральны неф, выкананы з ажурнага каванага металу (XVII ст.). Над прытворам хоры з арганам, устаноўленым у 1680-я гады пры гвардыяне Антоніі Гладавіцкім і дэкарыраваным разьбой па дрэве.



У кампазіцыі ўсіх 14 алтароў (а выключэннем аднаго алтара, зробленага ў XX-м ст. мясцовым рэзчыкам І. Болдакам) выкарыстаны элементы карынфскага ордэра, скульптура, алтарныя карціны. Асаблівую мастацкую каштоўнасць маюць скульптурныя і гарэльефныя стукавыя кампазіцыі Ларэтанскай капэлы “Чатыры евангелісты”, “Святое сямейства”, “Маленне аб чашы”, якія выкананы ў стылі рэнесансу. Трох’ярусны галоўны алтар драўляны, аздоблены стукавай скульптурай і арнаментам. У яго кампазіцыі арганічна ўключаны высокія спараныя вокны апсіды, у якіх захаваліся вітражы. Ярусы алтара вылучаны ступеньчатым пастаментам і раскрапаваным антаблементам, завершаны прамавугольным атыкам. Сцены прэсбітэрыя да ўзроўню акон пакрыты дубовымі панэлямі, на іх – драўляныя прамавугольныя пано. Дэкаратыўнае афармленне гал. алтара, прэсбітэрыя цэнтраль- нага нефа (спалучэнне элементаў рэнесансу, барока і класіцыстычных матываў) дае падставу датаваць інтэр’ер XVII – канцом XVIII ст. Жылы корпус далучаны да паўднёвай сцяны касцёла. Двухпавярховы аб’ём у плане складанай канфігурацыі. Сцены члянёны прамавугольнымі вокнамі, пілястрамі, контрфорсамі. Усходняе і паўднёвае крылы вылучаны буйнымі рызалітамі з трохвугольнымі шчытамі, завершанымі двухсхільным дахам. Планіроўка галерэйная. Вежа-званіца прымыкае да галоўнага фасада

касцёла з паўднёвага боку. Мае самастойны ўваход і звязана з касцёлам і жылым корпусам. 2 верхнія ярусы званіцы, перабудаваныя ў 1788 г., выкананы ў стылі позняга барока. Яны маюць складаную фігурную пабудову і маляўнічы сілуэт. У іх пластычным афармленні выкрыстаны выцягнутыя паверхні сцен, рэльефныя чляненні, вуглавыя калонкі і валюты. Вежа завершана фігурнай галоўкай са шпілем.

У будынках кляштара размяшчаліся: судова-гісталагічная лабараторыя, бюро судова-медыцынскай экспертызы, абл. дом санітарнай асветы, санэпідэмстанцыя, памяшканні для служак касцёла. Зараз касцёл дзейнічае, у кляштары знаходзіцца духоўная семінарыя. Помнік рэспубліканскага значэння.

**Бібліяграфія**


- Аляксееў, Л.В. Кляштар бернардзінаў // Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі панямоння. – Мінск, 1996. – С. 47.
- Багласаў, С.Г. Гродзенскі кляштар бернардзінцаў / С.Г. Багласаў, М.М. Яніцкая // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. - Т. 5. – С. 432.
- Багласаў, С.Г. Гродзенскі касцёл і кляштар бернардзінцаў / С.Г. Багласаў, М.М. Яніцкая // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 174.
- Багласаў, С.Г. Кляштар бернардзінцаў / С.Г. Багласаў, М.М. Яніцкая // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 59.
- Вашкевич, А. Ворота бернардинского монастыря : [в рамках проекта "Веч. Гродно" "Красная книга Гродно" по сохранению материалов о зданиях и уголках Гродно, которым грозит исчезновение] // Вечерний Гродно. - 2012. - 7 нояб. - С. 27.
- Габрусь, Т.В. [Касцёл кляштара бернардзінцаў у Гродне] // Габусь Т.В. Мураваныя харалы. Сакральная архітэктура беларускага барока. – Мінск, 2001. – С. 78.
- Гродзенскі касцёл і кляштар бернардзінцаў / У.А. Чантурыя, А.М. Кулагін, Ю.В. Хадыка, В.В. Церашчатава // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 191.
- Гродненский костел обретения Святого Креста и монастырь бернардинцев // Туристская энциклопедия Беларуси / редкол.: Г.П. Пашков [и др.]; под общ. ред. И.И.Пирожника. – Мінск, 2007. – С. 158.
- Калнін, В.В. Бернардзінскі касцёл і кляштар / В.В. Калнін // Калнін В.В. Гродна ў дыялогу стагоддзяў : фотаальбом. – Мінск, 2008. – С. 87.
- Карнілава, Л.А. Гродзенскі кляштар бернардзінцаў / Л.А.Карнілава // Рэлігія і царква на Беларусі : энц.даведнік. – Мінск, 2001. – С. 80.

- Карнілава, Л.А. Гродзенскі кляштар бернардзінцаў (1595 - 1853) / Л.А. Карнілава // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Гродна. – Мінск, 2000. – С. 693.
- Карнілава, Л. Гродзенскі кляштар бернардзінцаў / Л. Карнілава // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / гал. рэд. Г.П. Пашкоў. – Мінск, 1996. – Т. 3. – С. 135.
- Кишик, Ю.Н. Накопление архитектурных доминант. XVII - XVIII вв. / Ю.Н. Кишрик // Кишик, Ю.Н. Градостроительное наследие Беларуси. Гродно / Ю.Н. Кишик. - Минск, 2012. - С. 78 - 97.
- Кулагін, А.М. Касцёл адшукання Святога Крыжа і кляштар бернардзінцаў / А.М. Кулагін // Кулагін А.М. Каталіцкія храмы на Беларусі : энцыкл. даведнік / А.М. Кулагін. – Мінск, 2000. – С. 41.
- Кулагін, А.М. Касцёл адшукання Святога Крыжа і кляштар бернардзінцаў / А.М. Кулагін // Кулагін А.М. Каталіцкія храмы Беларусі : энцыкл. даведнік / А.М. Кулагін. – Мінск, 2008. – С. 102.
- Марціновіч, А. Кляштары бернардзінцаў і дамініканцаў / А. Марціновіч // Горадна, Горадзен, Гродна : нарысы / аўт. тэксту А.Марціновіч, фотаздымкі А.Ласмінскага. – Мінск, 2008. – С. 48.
- Паўлоўская, Г. Апісанне гарадзенскіх соймікаў у хроніках бернардзінскага кляштара // Гарадзенскі палімпсест. 2009. Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё. 15 - 20 ст. - Гародня, 2009. - С. 220 - 237.
- Трусов, И. Г. Гродненские архитекторы и строители 12 – 18 веков / И.Г. Трусов. – Гродно : ЮрСаПринт, 2012. – 72 с. : ил.
- Чантурия, В.А. [Бернардинский костел в Гродно] / В.А. Чантурия // Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии : в 2 т. / В.А. Чантурия. – Минск, 1985. – Т. 1. – С. 110.

- Ветка, С. [Музычнае свята...] / С. Ветка // Літаратура і мастацтва. - 2007. - 26 студз. - С. 10.
- Гаврицкий, С. Соколы прилетели! / С.Гаврицкий // Гродзенская праўда. - 2009. - 15 ліп. - С. 1.
- Пронская, А. Новый зал для Моцарта / А.Пронская // Вечерний Гродно. - 2007. - 10 янв. - С. 32.
- Фралоў, А. Галілей ведаў пра Беларусь тое, што мы адкрываем наноў / А.Фралоў // Краязнаўчая газета. - 2008. - № 41 ( лістап.) - С. 3, 5.
- Черкес, Н. Редкие птицы в Гродно : [о паре редких соколов, поселившихся в одной из ниш Гродненского бернардинского костела] / Н. Черкес // Перспектива. - 2009. - 4 сент. - С. 5.
- Соколиный глаз [о паре редких соколов, поселившихся в одной из ниш Гродненского бернардинского костела] // Гродзенская праўда. - 2010. - 7 крас. - С. 8.

- Вашкевич, А. Попробуй прокорми! : [о паре редких соколов, поселившихся в одной из ниш Гродненского бернардинского костела] // Гродзенская праўда. - 2010. - 26 мая. - С. 8.

## Гродзенскі касцёл і кляштар брыгітак

Помнік архітэктуры ранняга барока. Комплекс пабудаваны ў 1634 – 42 гг. па фундацыі К. і А. Весялоўскіх. Уключаў Благавешчанскі касцёл, жылы корпус, мураваную агароджу з брамамі (захавалася часткова), гаспадарчыя пабудовы (збярогся толькі драўляны лямус), сад, агарод, званіцу-капэлу, якая стаяла асобна, па другі бок вуліцы (знішчана ў 1960-я г.). Касцёл размешчаны ў паўночнай частцы комплексу. Аднанефавы 2-вежавы храм з паўцыркульнай апсідай, якая пераходзіць ў асноўны аб’ём і мае агульны з ім высокі дах, накрыты дахоўкай.



Галоўны фасад мае стройную сіметрычную кампазіцыю з 3-частакавым дзяленнем па вертыкалі на цэнтральную плоскасць і 2 вуглавыя вежы. Ніжні ярус галоўнага фасада члянёны плоскімі пілястрамі з карынфскімі капітэлямі, прарэзаны дзвярным і аконным праёмамі (у бакавых частках афармлены арачнымі нішамі для скульптур). Над пілястрамі праходзіць магутны раскрапаваны антаблемент, фрыз якога афармлены манументальна-дэкаратыўным жывапісам у тэхніцы сграфіта.

Галоўны фасад завершаны аднолькавымі па вышыні атыкам, 3-вугольным франтонам і 2-яруснымі дэкаратыўнымі вежачкамі. Інтэр’ер храма вырашаны як адзіны аб’ём, перакрыты цыліндрычным скляпеннем на распалубках. Паўцыркульная апсіда мае аднолькавую з нефам шырыню і вышыню, аддзелена ад яго выступамі-лапаткамі з падпружнай аркай. Над уваходам размешчаны хоры, якія іраюцца на 8-гранныя слупы. Лапаткі аздоблены рэшткамі паліхромнага расліннага арнаменту з матывамі вазонаў і гірлянд. Да паўночна-зах. сцяны касцёла прымыкае жылы корпус – прамавугольны ў плане 2-паверхавы аб’ём з вялікім унутраным дваром. На паўночным фасадзе захаваўся партал, аздоблены мастацкай тынкоўкай. Фасады члянёны маленькімі прамавугольнымі вокнамі ў простых ліштвах, завершаны шырокім карнізам. Па перыметры будынка (з боку двара) праходзіць светлавы калідор з келлямі. У паўднёва-ўсходнім вуглу корпуса размешчаны

вялікі аб’ём, на 1-м паверсе якога была трапезная, на 2-м – бібліятэка. Агароджа з брамай уяўляе сабой глухую цагляную атынкаваную сцяну, па вуглах якой былі невялікія 6-гранныя вежы (захаваўся 1-ы ярус вежы на перакрыжаванні вул. К. Маркса і Маладзёжнай). Агароджа была прарэзана 4 брамамі (захаваліся 3, найбольш манументальная знаходзіцца перад касцёлам). Захаваліся таксама брамы для пешага люду, уцалела праездная брама гаспадарчага двара. У будынках манастыра пэўны час знаходзілася мед. установа. Зараз касцёл дзейнічае, іншыя будынкі патрабуюць рэстаўрацыі. Комплекс – помнік рэспубліканскага значэння.

**Бібліяграфія**


- Аляксееў, Л.В. Брыгіцкая вуліца і кляштар брыгітак / Л.В. Аляксееў // Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі Панямоння / Л.В. Аляксееў. – Мінск, 1996. - С. 48.
- Багласаў, С.Г. Гродзенскі касцёл і кляштар брыгітак / С.Г. Багласаў, Т.Р. Маліноўская // Архітэктура Беларусі: энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 175.
- Багласаў, С.Г. Гродзенскі кляштар брыгітак / С.Г. Багласаў, Т.Р. Маліноўская // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. - Т. 5. – С. 432.
- Багласаў, С.Г. Кляштар брыгітак / С.Г. Багласаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 61.
- Гродненский костел Благовещения Пресвятой Девы Марии и монастырь бригиток // Туристская энциклопедия Беларуси / редкол.: Г.П. Пашков [и др.]; под общ. ред. И.И.Пирожника. – Минск, 2007. – С. 158.
- Дзярновіч, А. Ордэн Святой Брыгіты / А. Дзярновіч // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Гродна. – Мінск, 2000. – С. 95.
- Калнін, В.В. Брыгіцкі кляштар / В.В. Калнін // Калнін В.В. Гродна ў дыялогу стагоддзяў : фотаальбом. – Мінск, 2008. – С. 95.
- Карнілава, Л.А. Гродзенкі кляштар брыгітак / Л.А. Карнілава // Рэлігія і царква на Беларусі : энцыкл. даведнік / рэдкал. Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 2001. – С. 80.
- Карнілава, Л. Гродзенскі кляштар брыгітак / Л.Карнілава // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / гал. рэд. Г.П. Пашкоў. – Мінск, 1996. – Т. 3. – С. 135.
- Кишик, Ю.Н. Накопление архитектурных доминант. XVII - XVIII века / Кишик, Ю.Н. Градостроительное наследие Беларуси. Гродно. - Минск, 2012. - С. 78 - 97.
- Кишик, Ю.Н. Сеть композиционно-видовых связей. Начало XX века Кишик, Ю.Н. Градостроительное наследие Беларуси. Гродно. - Минск, 2012. - С. 88 - 217.

- Кулагін, А.М. Касцёл Дабравешчання Найсвяцейшай Дзевы Марыі і кляштар брыгітак / А.М. Кулагін // Кулагін А.М. Каталіцкія храмы на Беларусі : энцыкл. даведнік. – Мінск, 2000. – С. 45.
- Кулагін, А.М. Касцёл Звеставання Найсвяцейшай Дзевы Марыі і кляштар брыгітак / А.М. Кулагін // Кулагін А.М. Каталіцкія храмы Беларусі : энцыкл. даведнік. – Мінск, 2008. – С. 104.
- Марціновіч, А. Кляштар брыгітак / А. Марціновіч // Горадна, Горадзен, Гродна : нарысы / аўт. тэксту А.Марціновіч, фотаздымкі А.Ласмінскага. – Мінск, 2008. – С. 44.
- Чантурыя, У.А. Гродзенскі касцёл і кляштар брыгітак / У.А. Чантурыя // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 191.
- Чантурия, В.А. [Бригитский костел в Гродно] / В.А. Чантурия // Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии : в 2 т. – Мінск, 1985. – Т. 1. – С. 181.

- Кот, В. Тайны кляштарнага двара / В.Кот // Гродзенская праўда. - 2007. - 15 жн. - С.26.
- Вишневская, Т. Мощи заступника города - в Побригитском костеле / Т.Вишневская // Перспектива. - 2008. - 22 мая. - С. 4.
- Островцова, И. Святые заступники / И.Островцова // Вечерний Гродно. - 2009. - 11 марта. - С. 7.
- Ануфриева, О. Жертва монахинь / О.Ануфриева // Беларускі час. - 2009. - 29 мая - 4 июня. - С. 29.
- Швед, В. Кляштар на важнай магістралі : [пра Брыгіцкі кляштар у Гродне] // Гродзенская праўда. - 2012. - 22 лют. - С. 8.
- Сяменава, А. З'ява нябесная : [Гродзенскі Пабрыгіцкі касцел (Дабравешчання Найсвяцейшай Панны Марыі)] // Народная газета. - 2012. - 23 кастр. - С. 5.
- Вашкевич, А. Лямус бригиток : об одноим. памятнике деревянного зодчестве в Гродно (17 в.) в рамках проекта "Веч. Гродно" "Красная книга Гродно" по сохранению материалов о зданиях и уголках Гродно, которым грозит исчезновение // Вечерний Гродно. - 2012. - 6 июня. - С. 8.
- Вашкевич, А. Колокольня гродненских бригиток : [об уничтоженной в 1960-х гг. колокольне бригитского костела в рамках проекта "Веч. Гродно" "Красная книга Гродно" по сохранению материалов о зданиях и уголках Гродно, которым грозит исчезновение] // Вечерний Гродно. - 2012. - 19 дек. - С. 29.


## Гродзенскі касцёл і кляштар іезуітаў

Помнік архітэктуры барока. Пачаў фарміравацца пасля 1622 г. у цэнтры Гродна, на ўсходнім баку Старога рынка (зараз пл. Савецкая). У комплекс уваходзілі касцёл, стары і новы будынкі калегіума,

бібліятэка, будынак аптэкі, друкарня, жылыя карпусы і гаспадарчыя пабудовы. Першы езуіцкі “касцёльчык” Пятра і Паўла быў узведзены з дрэва і існаваў з 2-й чвэрці XVII ст. да 1700 г.

Будаўніцтва езуіцкай рэзідэнцыі пачалося пасля 1664 г., калі яна атрымала статус калегіума, мураванага касцёла – у 1678 г. (фундатары Самуэль і Канстанцыя Лозы). Першае набажэнства ў касцёле адбылося ў 1700 г., асвячэнне ў імя Ксаверыя, на якім прысутнічалі Аўгуст II і рускі цар Пётр I, - у 1705 г. У 1707 г. рэзчык з Каралеўца (цяпер Калінінград) К.Пойкер (?) распрацаваў праекты ўсіх алтароў (кулісныя і бакавыя былі выкананы ў 1709 – 1716 гг., галоўны – разьбяром Я. Шмідтам з Рэшэля ў 1736 – 1737 гг.). У 1725 г. на вежу-званіцу касцёла быў перанесены гадзіннік (помнік тэхнікі сярэднявечча), які выконваў ролю гарадскога і знаходзіўся раней на вежы калегіума. У 1744 г. у Каралеўцы закуплены арган, у 1745 г. у Рэшэлі - цыборыум (балдахін над алтаром). У 1750 – 1752 гг. муляр К. Бурман надбудаваў вежы. У гэты ж час быў зроблены новы амбон і выкананы фрэскавы цыкл.



Стары мураваны калегіум будавалі ў 1677 – 1783 гг. 1-ы паверх новага калегіума ўзведзены ў 1691 г., 2-і і 3-і - у 1740 – 1744 гг. Касцёл (з 1783 г. наз. фарны) – 3-нефавая крыжова-купальная базіліка (выш. 53,6 м., у плане 30 х 60 м.). Трансепт і цэнтральны неф маюць аднолькавую вышыню і вышэйшыя за бакавыя нефы. На ветразях сяродкрыжжа ўстаноўлены светлавы барабан, сферычны купал і ліхтар. Па баках паўцыркульнай апсіды прыбудаваны 2 капліцы са сферычнымі купаламі – архангела Міхаіла і Маці Божай Студэнцкай. Двухвежавы амаль плоскі фасад падзелены паясамі антаблементаў на 3 ярусы, 2 ніжнія раскрапаваны падвойнымі карынфскімі пілястрамі. У арачных нішах драўляныя выявы апосталаў Пятра і Паўла, Св. Ксаверыя (разьбяр Г. Гіс, 1768) У цэнтры фасада – вялікае акно і балкон для аркестра. Сілуэт ажыўляюць увагнутыя сцены і 2 вазы мураваных барочных купалаў над вежамі. Двухмаршавая лесвіца, упрыгожаная фігурай Хрыста з крыжам перад галоўным уваходам, была пабудавана ў пач. XX ст. Каваныя жалезныя дзверы галоўнага ўвахода зроблены кавалём Я.Біршам (1744). Бакавыя фасады выкананы ў стрыманых формах ранняга барока: раскрапаваны падвойнымі пілястрамі і тонкімі карнізнымі паясамі. Бакавыя нефы высокія (10,5 м.), без крытых галерэй, асветлены вялікімі лучковымі і

арачнымі праёмамі. Плітачная падлога выкладзена “шведскім” (гатляндскім) каменем. Нефы перакрыты крыжовымі скляпеннямі, гурты якіх упрыгожаны раслінным арнаментам. Па перыметры гал. нефа над антаблементам размешчана галерэя з балюстрадай; яго сцены раскрапаваны адзіночнымі карынфскімі пілястрамі (капітэлі выкананы з дрэва). Пры ўваходзе – хоры з арганам, да якіх вядуць вітыя ўсходы ў тоўшчы сцен. Высокамастацкі багаты і ўрачысты інтэр’ер насычаны скульптурай, архітэктурнай пластыкай і фрэскамі. Галоўны драўляны алтар (выш. 21 м.) зроблены ў 1736 г. з дрэва ў стылі позняга барока. У ніжнім ярусе размешчаны 13 скульптурных выяў – св. Ксаверыя, 10 апосталаў і патронаў-фундатараў, у другім – Хрыста, 4 евангелістаў і 4 айцоў царквы. Алтар завешаны глорыяй, якая абрамляе акно апсіды. Перад ёй схіляюць галовы 4 бакі свету, увасобленыя ў жаночых вобразах. Таніраваны пад светлы мармур у 1752 г., перафарбаваны пад цёмны ў 1900 г. У касцёле 12 бакавых алтароў: 2 ў капліцах, 4 ў трансепце і 6 кулісных. Адзін мураваны алтар у капліцы Маці Божай Студэнцкай выкладзены ў тэхніцы стука ў стылі клсіцызму. Алтар св. Міхаіла ў паўночнай капліцы больш ранні (верагодна застаўся ад даўлянага “касцёльчыка”). Алтары трансепта вузкія і высокія, з высунутымі наперад бакавымі крыламі. Таніраваны пад цёмны мармур. Маюць 2-ярусую кампазіцыю, аздоблены пазалочанымі калонамі, скульптурнымі выявамі, ажурнай разьбой. Яскравым мастацка-дэкаратыўным элементам інтэр’ера з’яўяецца ўпрыгожаны высокім балдахінам амбон, які падтрымліваецца ракавінай-кансоллю. Выкананы ў стылі ракако, мае характэрныя мудрагелістыя формы, аздоблены багатай пазалочанай разьбой, скульптурнымі выявамі евангелістаў, анёлаў і амураў у імклівых пастаавах. У стылі ракако выкананы таксама спавядальні (частка іх зроблена майстрам І. Мейфельдтам у 1768 г.). Фрэскавы жывапіс складаецца з 14 сюжэтных кампазіцый з жыцця св. Ксаверыя, якія аздабляюць прасценкі над аркамі цэнтральнага нефа, трансепта і прэсьбітэрыя. Падкрэслены асіметрычныя шматфігурныя кампазіцыі фрэсак з пейзажам і архітэктурным фонам упісаны ў прамавугольныя рамы. Малюнак упэўнены, свабодны. На апошняй выяве манаграма “B. I.: D. P. 1752”.

Высокамастацкі інтэр’ер касцёла дапаўняюць помнік А.Тызенгаўзу (пач. ХХ ст., скульптар Т.Дукас, бронза, лабрадарыт) у выглядзе жанчын з пальмавымі галінкамі, якія схіліліся на прыступках надмагілля перад медальёнам з рэльефным бюстам памерлага, мемарыяльная дошка прафесару фізікі Ягелонскага універсітэта З.Ф. Урублеўскаму (1845 – 1888 гг.), шматлікія творы дэкаратыўна–прыкладнога мастацтва.

Кяштар займаў цэлы квартал (120 х 160м), у сярэдзіне якога знаходзіўся калегіум. Гал. 3-павярховае крыло (новы калегіум) мела мансардавы дах, накрыты чырвонай дахоўкай. Зах. 2-павярховае крыло злучала новы калегіум з трансептам касцёла. Усх. 3-павярховае

крыло (стары калегіум) мела калідорную планіроўку з 2-баковым размяшчэннем пакояў. На стыку новага і старога калегіумаў была ўзведзена трапезная (арх. Я. Роуф), над якой заходзілася бібліятэка з вялікімі сенцамі, вышэй над сенцамі – капліца. Абапал старога калегіума размяшчаліся гаспадарчыя двары, агароджаныя з тыльнага боку комплексу флігелямі, дзе былі майстэрні, стайні і вазоўні. Пры галоўнай браме стаяла бурса. Побач з касцёлам знаходзіцца будынак аптэкі. На поўнач ад яго была мураваная школа з уласным дваром (у гэтым а будынку размяшчаўся тэатр). Астатнюю тэрыторыю займаў вялікі сад. Захаваліся касцёл, аптэка, стары і новы калегіумы, бурса, трапезная, бібліятэка, майстэрні, стайні, вазоўні. Будынак касцёла належыць рымска-каталіцкай царкве. Комплекс – помнік рэспубліканскага значэння.

**Бібліяграфія**


- Аляксееў, Л.В. Езуіцкі (фарны) касцёл / Л.В. Аляксееў // Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі Панямоння / Л.В. Аляксееў. – Мінск, 1996 . – С. 43.
- Багласаў, С.Г. Кляштар езуітаў / С.Г.Багласаў, М.М. Яніцкая // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 63.
- Блінова, Т.Б. Гродзенскі езуіцкі калегіум / Т.Б. Блінова // Рэлігія і царква на Беларусі : энцыкл. даведнік / рэдкал. Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 2001. – С. 79.
- Габрусь, Т.В. [Касцёл св. Францішка Ксаверыя ў Гродне] / Т.В. Габрусь // Габрусь Т.В. Мураваныя харалы. Сакральная архітэктура беларускага барока / Т.В. Габрусь. – Мінск, 2001. – С. 150.
- Гардзееў, Ю. Помнік Антонію Тызенгаўзу ў Гродзенскім фарным (былым езуіцкім) касцёле / Ю. Гардзееў // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Гродна. – Мінск, 2000. – С. 113.
- Гродзенскі касцёл і кляштар езуітаў / У.А. Чантурыя, А.М. Кулагін, Ю.В. Хадыка, В.В. Церашчатава // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 192.
- Гродзенскі кафедральны касцёл Францыска Ксаверыя: навукова - папулярнае выданне. - Мінск, 2005. – 82 с.
- Гродненский костел Франциска Ксаверия и монастырь иезуитов // Туристская энциклопедия Беларуси / редкол.: Г.П. Пашков [и др.]; под общ. ред. И.И.Пирожника. – Минск, 2007. – 159.
- Калнін, В.В. Фарны касцёл / В.В. Калнін // Калнін В.В. Гродна ў дыялогу стагоддзяў : фотаальбом / В.В. Калнін. – Мінск, 2008. – С. 79.
- Кулагін, А.М. Касцёл Святога Францыска Ксаверыя і кляштар іезуітаў / А.М. Кулагін // Кулагін А.М. Каталіцкія храмы на Беларусі : энцыкл. даведнік. – Мінск, 2000. – С. 48.

- Кулагін, А.М. Касцёл Святога Францішка Ксаверыя і калегіум іезуітаў / А.М. Кулагін // Кулагін А.М. Каталіцкія храмы Беларусі : энцыкл. даведнік / А.М. Кулагін. – Мінск, 2008. – С. 108.
- Марціновіч, А. Кляштар езуітаў / А. Марціновіч // Горадна, Горадзен, Гродна : нарысы / аўт. тэксту А.Марціновіч, фотаздымкі А.Ласмінскага. – Мінск, 2008. – С. 38.
- Мілінкевіч, А.У. Гродзенскі касцёл і кляштар езуітаў / А.У. Мілінкевіч, Е.Пашэнда // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 176.
- Мілінкевіч, А.У. Гродзенскі касцёл і кляштар езуітаў / А.У. Мілінкевіч, Е.Пашэнда // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. - Т. 5. – С. 433.
- Трусаў, А. Гродзенскі кляштар езуітаў / А.Трусаў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / гал. рэд. Г.П. Пашкоў. – Мінск, 1996. – Т. 3. – С. 136.

- Васильев, С. Часы, достойные Книги рекордов Гиннеса / С. Васильев // Гродзен. праўда. - 2005. - 18 студз. - С. 1.
- Черкес, Т. Бой часов на фарном костеле / Т. Черкес // ВечернийГродно. - 2005. - 24 авг. - С. 8.
- Русак, Н. Фара над Гародняй у нябесных аблоках / Н.Русак // Культура. - 2005. - № 52 (24 - 30 снеж.). - С. 11.
- Саласюк, Е. Еще идут старинные часы / Е.Саласюк // Гродзенская праўда. - 2005. - 6 кастр. - С. 8.
- Бажэнава, В. Богам збяражоныя шэдэўры / В.Бажэнава // Мастацтва. - 2006. - № 5. - С. 67 – 69.
- Болванович, М. Симфония Фарного костела / М. Болванович // Гродзенская праўда. - 2006. - 18 мая. - С.4.
- Горел алтарь // Гродзенская праўда. - 2006. - 15 ліп. - С. 8.
- Гузень, Е. Дело о пожаре / Е.Гузень // Гродзенская праўда. - 2006. - 5 авг. - С.2.
- Віфлеемскі агонь міру і дружбы перададзены ў Гродзенскі кафедральны касцел // Звязда. - 2006. - 23 снеж. - С. 3.
- Карлоўскі, А. Гадзіннік у інтэр'еры мінулага часу / А. Карлоўскі // Беларусь. - 2006. - №2. - С. 28 - 29.
- Мацюшонак, Э. Вандроўка. Гродна / Э.Мацюшонак // Маладосць. - 2006. - № 8. - С.8; кал. укл.
- Чаровская, К. Спешите слышать! / К. Чаровская // Звязда. - 2006. - 28 крас. – С. 20.
- Чаровская, К. На Бога надейся, но сам не плошай / К. Чаровская // Советская Белоруссия. - 2006. - 19 авг. - С.4.
- Мосько, Р. Пожарный извещатель…в храме / Р.Мосько // Гродзенская праўда. - 2006. - 24 авг. - С.4.
- Островцова, И. Дым над алтарем / И. Островцова // Вечерний Гродно. - 2006. - 19 июля. - С.3.

- Островцова, И. Алтарь могли спасти? / И. Островцова // Вечерний Гродно. - 2006. - 26 ліп. - С.2.
- Юсубова, Н. Фарный горел впервые / Н. Юсубова // Перспектива. - 2006. - 18 ліп. - С. 2.
- Юсубова, Н. Францисканский костел закроют? / Н. Юсубова // Перспектива. - 2006. – 31 авг. - С. 6.
- Янчевская, Ж. Туринская плащаница - в Фарном костеле / Ж. Янчевская // Гродзен. праўда. - 2006. - 10 жн. - С. 4.
- Островцова, И. О чем звонил колокол / И. Островцова // Вечерний Гродно. - 2006. - 23 авг. – С. 9.
- Пракопчык, Б. Арганны фестываль у касцеле / Б. Пракопчык // Звязда. - 2006. - 28 крас. - С. 2.
- Семенова, Е. Три века Фарного костела / Е. Семенова // Народная газета. - 2006. - 1 ліст. - С. 4.
- Родионов, В. Симфония звуков органа фарного костела / В. Родионов // Неман. - 2006. - № 9. - С. 194 – 200.
- Данилович, И. Вифлеемский огонь в Гродно / И. Данилович // Милицейский вестник. - 2006. - 28 снеж. - С.1.
- Градюшко, Н. Машина времени / Н. Градюшко // Рэспубліка. - 2006. - 30 снеж. - С. 4.
- Загідуліна, М. Постаць : да 200-годдзя Напалеона Орды / М. Загідуліна // Гродзенская праўда. - 2007. - 22 лют. - С.4.
- Лосминский, А. По ступеням столетий / А.Лосминский // Гродзенская праўда. - 2007. - 3 окт. - С.6.
- Беларусь. Гродно. Фарный костел // Аргументы и факты. - 2007. - 17 мая. - С. 23.
- Вишневская, Т. Скульптура к Рождеству / Т. Вишневская // Перспектива. - 2008. - 24 дек. - С. 5.
- Гришук, И. Свет Вифлеема / И. Гришук // Вечерний Гродно. - 2008. - 17 снеж. - С. 3.
- Гришук, И. Восставший из пепла / И. Гришук // Вечерний Гродно. - 2008. - 24 дек. - С. 1,2.
- Островцова, И. Восставшие из пепла. После пожара в Фарном костеле нашли фигуру ангела / И. Островцова // Вечерний Гродно. - 2008. - 23 янв. - С. 8.
- Островцова, И. Небесная механика / И. Островцова // Вечерний Гродно. - 2008. - 9 апр. - С. 32.
- Островцова, И. Божественная нота / И. Островцова // Вечерний Гродно. - 2008. - 15 окт. - С. 8.
- Самусик, Е. Небесная механика / Е. Самусик // Вечерний Гродно. -2008. - 28 марта. - С. 31.
- Семенова, А. По ступеням времени / Е. Семенова // Народная газета.- 2008. - 27 жн. - С. 3.
- Юсубова, Н. Фарный подвела проводка / Н. Юсубова // Перспектива. - 2008. - 24 янв. - С. 4.

- Гришук, И. Страсти Христовы / И. Гришук // Вечерний Гродно. - 2009. - 8 крас. - С. 29.
- Цвет на алтарь // Гродзенская праўда. - 2009. - 1 ліп. - С. 31.
- Янчевская, Ж. Возвращение апостола Фомы / Ж. Янчевская // Гродзенская праўда. - 2009. - 5 авг. - С. 32.
- Гришук, И. В Францисканском костеле "оживили" механическую батлейку / И. Гришук // Вечерний Гродно. - 2010. - 29 дек. - С. 26.
- Гришук, И. Вифлеемский огонь озарил Гродно / И. Гришук // Вечерний Гродно. - 2011. - 21 снеж. - С.2.
- Швед, В. Касцёл па рымскаму ўзору : [гісторыя касцёла Св. Францыска-Ксаверыя (Фарнага) ў Гродне і помніка А.Тызенгаўзу ў касцёле / В. Швед // Гродзенская праўда. - 2012. - 25 студз. - С. 8.
- Вашкевич, А. Лава : [о старинной (17 в.) скамье-лаве в Гродн. фарном костеле и рисунках на ней изображенных (в рамках проекта "Девять гродненских артефактов")] / А. Вашкевич // Вечерний Гродно. - 2013. - 13 февр. - С. 29.

## Гродзенскі касцёл і кляштар францысканцаў

Помнік архітэктуры барока. Комплекс пабудаваны ў 1635 г. у Гродне (вул. Гагарына) па фундацыі Сузаны і Яўстахі Курч. Размешчаы на левым беразе Нёмана. Складаны рэльеф мясцовасці вызначыў асіметрычную кампазіцыю комплексу.



Уключае касцёл, вежу-званіцу, кляштарны корпус, браму з агароджай. Мураваныя касцёл і 2-павярховы кляштарны комплекс утвараюць замкнуты ўнутраны двор. Касцёл – 3-нефавая базіліка з паўцыркульнай апсідай. Цэнтральны неф і апсіда вырашаны адзіным аб’ёмам і накрыты агульным 2-схільным чарапічным дахам, больш нізкія бакавыя нефы – аднасхільнымі. Галоўны фасад падзелены на тры ярусы: 1-ы ярус расчлянёны шырокімі пілястрамі і завершаны карнізным поясам, 2-і і 3-і – лапаткамі і завершаны 3-вугольным

франтонам. Бакавыя фасады і апсіда прарэзаны лучковымі і прамавугольнымі вокнамі, расчлянёнымі спаранымі лапаткамі і завершаны карнізным поясам. У XVIII ст. касцёл адноўлены пасля пажару, значна зменена яго дэкаратыўная аздоба. З паўночнага боку да галоўнага фасада касцёла прылягае 3-ярусная вежа-званіца з самастойным уваходам. Мае квадратную ў плане 3-ярусную сіметрычную кампазіцыю. 1-ы ярус, які прымыкае да сцяны бакавога нефа касцёла, захаваў агульную з 1-м ярусам галоўнага фасада касцёла пластыку XVII ст. Ён прарэзаны маленькімі паўцыркульнымі аконнымі праёмамі, расчлянёны шырокімі пілястрамі і карнізымі паясамі. 2-і і 3-і ярусы перабудаваны ў XVIII ст., вырашаны ў насычанай рэльефнай пластыцы сталага барока: выразныя буйныя чляненні, маляўнічы сілуэт.

Сцены прарэзаны вялікімі паўцыркульнымі і паўкруглымі аконнымі праёмамі, расчлянёны рэльефнымі лапаткамі і развітым карнізам. Увенчвае званіцу высокі фігурны шлем. У тэхніцы паліхромнай размалёўкі па шкле зроблены вітражы. Цэнтральны неф касцёла аддзелены ад бакавых 6 слупамі і перакрыты крыжовымі скляпеннямі. Пры ўваходзе – хоры. Інтэр’ер вызначаецца багаццем архітэктурнай пластыкі, мастацка-дэкаратыўным аздабленнем (разьба па дрэве, лепка, скульптура). 2-ярусны галоўны алтар у стылі барока ўпрыгожаны скульптурай і накладной драўлянай разьбой. Амбон у стылі ракако дэкарыраваны гарэльефнымі выявамі 4 евангелістаў. П-падобны няправільны ў плане кляштарны корпус прыбудаваны да касцёла з паўднёвага боку. Сцены расчлянёны прамавугольнымі вокнамі, пілястрамі, завершаны карнізам. Паўднёва-заходні бок корпуса вылучаны буйным рызалітам. Планіроўка галерэйная. У паўднёва-заходнім баку корпуса знаходзіцца вялікі ў выглядзе рызаліта аб’ём, дзе былі трапезная і бібліятэка. 1-ы паверх мае скляпеністыя перакрыцці, 2-гі - плоскае. Зараз тут размешчана бальніца. У паўночна-заходняй частцы кляштара захавалася фрагментарная агароджа (2 – 3 м.) і брама. Частка сцяны, якая абмяжоўвае дворык перад галоўным фасадам касцёла, афармлена ў стылі барока. Мае 2-ярусную кампазіцыю. 1-ярус з арачным праходам раскрапаваны спаранымі пілястрамі., 2-і вырашаны ў выглядзе разарванага франтона, сярэдняя частка якога – атык з прамавугольнай нішай для скульптуры. Увенчвае атык трохвугольны франтон. Касцёл дзейнічае. Помнік рэспубліканскага значэння.

**Бібліяграфія**


- Аляксееў, Л.В. Францысканскі кляштар і касцёл / Л.В. Аляксееў // Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі Панямоння / Л.В. Аляксееў. – Мінск, 1996. – С. 57.
- Багласаў, С.Г. Кляштар францысканцаў / С.Г. Багласаў, Г.М. Ярмоленка // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская

вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 65.

- Габрусь, Т.В. [Касцёл францысканцаў у Гродне] / Т.В. Габрусь // Габрусь Т.В. Мураваныя харалы. Сакральная архітэктура беларускага барока / Т.В. Габрусь. – Мінск, 2001. – С. 98.
- Гродненский костел Матери Божьей Ангельской и монастырь францисканцев // Туристская энциклопедия Беларуси / редкол.: Г.П. Пашков [и др.]; под общ. ред. И.И.Пирожника. – Минск, 2007. – С. 159.
- Калнін, В.В. Францысканскі кляштар / В.В. Калнін // Калнін В.В. Гродна ў дыялогу стагоддзяў : фотаальбом / В.В. Калнін. – Мінск, 2008. – С. 103.
- Кулагін, А.М. Касцёл Маці Божай Анельскай і кляштар францысканцаў [у Гродна] / А.М. Кулагін // Кулагін А.М. Каталіцкія храмы на Беларусі : энцыкл. даведнік / А.М. Кулагін. – Мінск, 2000. – С. 46.
- Кулагін, А.М. Касцёл Маці Божай Анельскай і кляштар францысканцаў [у Гродна] / А.М. Кулагін // Кулагін А.М. Каталіцкія храмы Беларусі : энцыкл. даведнік / А.М. Кулагін. – Мінск, 2008. – С. 106.
- Макарчык, Ю. Слуга божы Мельхіор Фардон францішканін (1862 - 1927) / Ю. Макарчык; пер. з польск. мовы Д. Бічэль-Загнетава. – Гродна, 2007. – 74 с.
- Чантурыя, У.А. Гродзенскі касцёл і кляштар францысканцаў / У.А. Чантурыя, С.Г. Багласаў, Г.М. Ярмоленка // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 178.
- Чантурыя, У.А. Гродзенскі кляштар францысканцаў / У.А. Чантурыя, С.Г. Багласаў, Г.М. Ярмоленка // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш – Мінск, 1997. - Т. 5. – С. 434.
- Чантурыя, У.А. Гродзенскі касцёл і кляштар францысканцаў / У.А. Чантурыя, С.Г. Багласаў, Г.М. Ярмоленка // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 192.
- Ярашэвіч, А.А. Гродзенскі кляштар францысканцаў / А.А. Ярашэвіч // Рэлігія і царква на Беларусі : энцыкл. даведнік. – Мінск, 2001. – С. 81.

- Антонова, А. И. Закружит батлейки хоровод : Старейшая механическая батлейка Беларуси - в Гродн. Францисканском костеле / А.И. Антонова // Гродзенская праўда. - 2011. - 24 снеж. - С. 8.
- Кишик, Ю.Н. Накопление архитектурных доминант. XVII - XVIII века / Ю.Н. Кишик // Кишик, Ю.Н. Градостроительное наследие Беларуси. Гродно / Ю.Н. Кишик. - Минск, 2012. - С. 78 - 97.
- Пракопчык, Б. Вяртанне каляднай батлейкі : [пра а. Аркадзя Вальтася (1916 - 1975 гг.), у 1941 - 1975 гг. служыў пробашчам у

Гродзен. Францішканскім касцеле] / Б. Пракопчык // Звязда. - 2011. - 11 студз. - С. 7.

- Бык, Ю. Показали редкие книги из костела францисканцев : [О выст. редких книг из бывшей библиотеки Ордена францисканцев в ГОНБ им.Е.Ф.Карского] / Ю. Бык // Вечерний Гродно. - 2012. - 31 окт. - С. 28.
- Антонова, А. Духовное наследие веков : [О выст. редких книг из бывшей библиотеки Ордена францисканцев в ГОНБ им.Е.Ф.Карского] / А.И. Антонова // Гродзенская праўда. - 2012. - 3 листап. - С. 1.
- Жвірыдоўская, А. Рарытэты з гарышча : [пра выставу кніг з фондаў былой бібліятэкі Ордэна францысканцаў ў ГАНБ ім.Я.Ф.Карскага] / А. Жвірыдоўская // Перспектива. - 2012. - 7 нояб. - С.5.

## Гродзенскі народны дом

Помнік грамадзянскай архітэктуры пач. XX ст. Пабудаваны ў Гродне (суч. вул. Дзяржынскага) у 1904 г. паводле праекта інж. Л.Лангада і арх. М.Раманава. Цагляны 1-павярховы сіметрычны будынак з крыху вынесенымі наперад бакавымі крыламі мае складаную канфігурацыю плана, дзе частка больш высокага аб’ёму з глядзельнай залай на 350 месцаў адсунута ўглыбіню. Трохвугольны франтон, фігурныя карнізы і атыкі, багацце дэкаратыўнай пластыкі (гарызантальны руст, абрамленне аконных і дзвярнога праёмаў разнастайных форм, пілястры па вуглах) надаюць пабудове маляўнічасць. Унутраная планіроўка адпавядала прызначэнню: тут была бібліятэка з чытальнай залай, пакоі для заняткаў гурткоў. У будынку размешчаны гарадскі Дом культуры.



**Бібліяграфія**

- Чарнатаў, В.М. Гродзенскі народны дом / В.М. Чарнатаў // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 180.
- Чарнатаў, В.М. Народны дом / В.М. Чарнатаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 71.

- Чарнатаў, В.М. Гродзенскага народнага дома будынак / В.М. Чарнатаў // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 175.

## Гродзенскі каралеўскі палац (Новы замак)

Помнік архітэктуры ракако. Пабудаваны ў 1734 – 51 гг. у Гродне каралём Аўгустам III на месцы Гродзенскага Ніжняга замка (суч. вул. Замкавая, 20). Асноўны праект К.Ф. Пёпельмана, у стварэнні палаца ўдзельнічалі архітэктары І.Х. Яўх і І.Ф. Кнобель (апошні дабудоўваў капліцу-капэлу). У 1798 г. рэканструяваны архітэктарам Дж.Сака. Выкарыстоўваўся як месца пасяджэнняў Генеральных сеймаў Рэчы Паспалітай, як палац Станіслава-Аўгуста Панятоўскага, пазней як шпіталь і адміністратыўны будынак. П-падобны ў плане 2-павярховы аб’ём пад мансардавым дахам утвараў парадны двор, які з боку Гродзенскага Старога замка заканчваўся 1-павярховымі флігелямі і брамай. З левага боку размяшчаліся службовыя корпусы (канцылярыя, стайня і інш.), якія ўтваралі ўнутраны двор. Фасады чляніліся адзінарнымі і падвойнымі лапаткамі, прамавугольнымі нішамі, згрупаванымі аконнымі праёмамі. Рызаліт у цэнтральнай частцы быў аздоблены падвойнымі пілястрамі, картушамі ў прасценках і на тымпане трохвугольнага франтона. З боку дваровага фасада да паўкруглага эркера была прыбудавана палацавая капліца, накрытая вальмавым дахам з шатровай званіцай з тарцовага фасада. У яе дэкоры выкарыстаны ракайльныя вазы, кветкавыя гірлянды, каралеўская карона, валюты, штучная драпіроўка, гірлянда званоў. Маляўнічае вырашэнне палаца дасягалася спалучэннем чырвонай дахоўкі, зялёнага колеру сцен і белых элементаў архітэктурнай пластыкі і ляпнога дэкору. Планіроўка клідорная з авальнай у плане цэнтральнай купальнай залай, ад якой адыходзілі парадныя памяшканні, вялікі вестыбюль, капліца. Жылыя памяшканні размяшчаліся на другім паверсе і ў мансардзе, службовыя памяшканні ў скляпенiстых падвалах. Інтэр’еры капліцы, Сенатарскай, Пасольскай і Круглай залаў былі ўпрыгожаны жывапісам, размаляванымі плафонамі, панелямі, стукавай залачонай лепкай у стылі ракако, скульптурай, паркетнай падлогай. У 1780-я гады інтэр’ер размаляваны сюжэтнымі сцэнамі (дэкаратар Манькоўскі). У першапачатковым выглядзе захавалася ўяздная брама, фланкіраваная манументальнымі пілонамі са скульптурамі сфінксаў, дэкаратыўнай вайсковай арматурай (створана пад уплывам творчасці франц. арх. Ф. Бландэля) У 1944 г. палац значна разбураны. Пасля перабудовы (1952 г., арх. У. Вараксін) у ім размяшчаўся Гродзенскі абком КПБ. Зараз палац падзелены паміж Гродзенскім гісторыка-арх. музеем і ГАНБ ім. Я.Ф. Карскага.



**Бібліяграфія**


- Аляксееў, Л.В. Новы замак / Л.В. Аляксееў // Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі Панямоння / Л.В. Аляксееў. – Мінск, 1996. – С. 30.
- Гродненский Королевский дворец // Туристская энциклопедия Беларуси / редкол.: Г.П. Пашков [и др.]; под общ. ред. И.И.Пирожника. – Минск, 2007. – 158 с.
- Гродненский Новый замок // Города, местечки и замки Великого княжества Литовского: энциклопедия / ред. совет: Т. В. Белова и др. – Минск, 2009. – С. 125.
- Кишик, Ю.Н. Накопление архитектурных доминант. XVII - XVIII века / Ю.Н. Кишик // Кишик, Ю.Н. Градостроительное наследие Беларуси. Гродно. - Минск, 2012. - С. 78 - 97.
- Кулагін, А.М. Новы замак / А.М. Кулагін, Э.М. Савіцкі // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 71.
- Орда, Н. Каралеўскі палац (Новы замак) у Гродне (1861 – 1869 гг.) [ізаматэрыял] / Н. Орда // Асіноўскі С. Што раньш было... / С. Асіноўскі. - Мінск, 2008. – С. 141.
- Сардаров, А.С. [Мост между Старым и Новым замками в Гродно] / А.С. Садаров // Сардаров А.С. Путетворение : история и культура белорусских дорог / А.С. Садаров. - Минск, 2009. - С. 136 - 137.
- Трусов, И. Г. Гродненские архитекторы и строители 12 – 18 веков / И.Г. Трусов. – Гродно : ЮрСаПринт, 2012. – 72 с. : ил.
- Чантурыя, У.А. Гродзенскі каралеўскі палац / У.А. Чантурыя, А.М. Кулагін // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 172.
- Чантурыя, У.А. Гродзенскі каралеўскі палац / У.А. Чантурыя, А.М. Кулагін // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 190.

- Чантурыя, У.А. Гродзенскі Новы замак / У.А. Чантурыя, А.М. Кулагін // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. - Т. 5. – С. 436.
- Швед, В.В. Тут жылі вялікія князі літоўскія і каралі польскія : [пра замкі і палацы Гродна] / В.В. Швед // Швед В.В. Горадня : вып. 2. – Гродна, 1997 – С. 4.
- Шимко, Л.В. Замковые сооружения Беларуси XIV - XVII вв. : [реферат] / Л.В. Шимко. - Гродно, 2011 – С. 20 – 22.

Островцова, И. Сокровища вернутся в Гродно / И. Островцова // Вечерний Гродно. - 2008. - 2 крас. - С. 31.

- Ивановский, В. Секрет, затаенный Неманом / В. Ивановский // Перспектива. - 2009. - 22 крас. - С. 31.
- Ивановский, В. Секрет, затаенный Неманом / В. Ивановский // Перспектива. - 2009. - 30 крас. - С. 28.
- Саенко, А. Копают возле замка / А. Саенко // Вечерний Гродно. - 2010. - 7 июля. - С. 2.
- Чаркес, Д. "Руны над Нёманам" / Д. Чаркес // Культура. - 2011. - 26 лістап. - С. 7.
- Вашкевич, А. Сфинксы Гродно: [о скульптурном изображении сфинксов на воротах Нового замка и легендах с ним сязанных (в рамках проекта "Девять гродненских артефактов")] / А. Вашкевіч // Вечерний Гродно. - 2013. - 20 февр. - С. 94.

## Гродзенскі Свята-Раства-Багародзіцкі манастыр (былы кляштар базыльянак)

Помнік архітэктуры барока. Пабудаваны ў 1720 – 51 гг. у цэнтральнай частцы Гродна (вул. Навазамкавая), на месцы сярэдневяковага пасада замест згарэлага драўлянага манастыра. Комплекс уключае мураваныя царкву Раства Багародзіцы, манастырскі і гаспадарчы карпусы, капліцу, дом ігуменні. Царква (1726 г., арх. І. Фантана ІІІ) – крыжовакупальны храм з выцягнутай прамавугольнай алтарнай часткай і 2 чацверыковымі вежамі з фігурнымі галоўкамі над крыламі трансепта. Галоўны фасад дэкарыраваны пілястрамі, раскрапоўкамі, завяршаецца развітым карнізам і трохвугольным франтонам. Купал на высокім барабане завершаны ліхтаром і цыбулепадобнай галоўкай. У інтэр’еры аб’ёмы перакрыты цыліндрычнымі скляпеннямі на падпружных арках, якія пераходзяць у падвойныя піястры. Пры ўваходзе з боку алтара абапал асноўнага нефа вітыя ўсходы, у паўночным крыле трансепта хоры, злучаныя з калідорам 2-га паверха манастырскага корпуса. Будынак манастыра (1751 г., арх. Фантана) 2-павярховы, Г-падобны ў плане, завершаны высокім 2-схільным дахам. Падоўжаным крылом ён прыбудаваны да царквы і ўтварае перад апсідай невялікі паўадкрыты дворык. Прамавугольныя вокны размешчаны нерэгулярна. Планіроўка

галерэйная, памяшканні перакрыты крыжовымі, калідоры – цыліндрычымі скляпеннямі. Да ўсходняга тарца манастыра ў XIX ст. прыбудавана прамавугольная ў плане капліца з 2-колерным вырашэннем фасадаў. Сцены раўнамерна расчлянёны лапаткамі, падзелены на 2 ярусы шырокім прафіляваным поясам і завершаны стылізаваным антаблементам з трыгліфамі на фрызе і зубчыкамі на карнізе.



Усходні тарцовы фасад завершаны франтонам. Вуглы аб'ёму апрацаваны магутнымі руставанымі пілястрамі. Вокны прамавугольныя, размешчаны ў ніжнім ярусе сцен паміж лапаткамі. На паўднёвым, павернутым да ўвахода ў царкву фасадзе, вокны апрацаваны ліштвамі. Інтэр'ер зальны з люстраным скляпеннем. Сцены завершаны прафіляваным карнізам. Асноўны гаспадарчы корпус (1891 г.) 2-павярховы, прамавугольны ў плане, размешчаны ва ўсходняй частцы комплексу. У 1979 – 85 гг. паводле праекта спецыялізаваных навукова-рэстаўрацыйных вытворчых майстэрняў Міністэрства культуры БССР (арх. Жаровіна) праведзены рэстаўрацыйныя работы. Пэўны час у комплексе размяшчаўся музей гісторыі рэлігіі. Зараз комплекс належыць праваслаўнай царкве і ў ім размяшчаецца Свята-Раства-Багародзіцкі жаночы манастыр. Помнік рэспубліканскага значэння.

**Бібліяграфія**


- Алісейчык, У.В. Гродзенскі манастыр базыльянак / У.В. Алісейчык, Г.П. Жаровіна // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 194.
- Алісейчык, У.В. Гродзенскі манастыр базыльянак / У.В. Алісейчык, Г.П. Жаровіна // Архітэктура Беларусі: энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 179.

- Габрусь, Т.В. [Царква Раства Багародзіцы у Гродне] / Т.В. Габрусь // Габрусь Т.В. Мураваныя харалы. Сакральная архітэктура беларускага барока. – Мінск, 2001. – С. 190.
- Гродненская Свято-Рождество-Богородицкая церковь и монастырь // Туристская энциклопедия Беларуси / редкол.: Г.П. Пашков [и др.]; под общ. ред. И.И.Пирожника. – Мінск, 2007. – С. 158.
- Гродненский Свято-Рождество-Богородичный женский монастырь. – 2-е изд. испр. и доп. – М., 2007. – 152 с.
- Калнін, В.В.Свята-Раства-Багародзіцкі (былы базыльянскі) манастыр / В.В. Калнін // Калнін В.В. Гродна ў дыялогу стагоддзяў : фотаальбом. – Мінск, 2008. – С. 109.
- Карнілава, Л. Гродзенскі манастыр базыльянак / Л. Карнілава // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / гал. рэд. Г.П. Пашкоў. – Мінск, 1996. – Т. 3. – С. 136.
- Карнілава, Л. Гродзенскі манастыр базыльянак / Л. Карнілава, Г.П. Жаровіна // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. - Т. 5. – С. 435.
- Карнілава, Л. Гродзенскі жаночы манастыр Раства Багародзіцы / Л. Карнілава // Рэлігія і царква на Беларусі : энцыкл. даведнік. – Мінск, 2001. – С. 79.
- Кулагін, А.М. Свята-Раства-Багародзіцкая царква і манастыр / А.М. Кулагін // Кулагін А.М. Праваслаўныя храмы Беларусі : энцыкл. даведнік / А.М. Кулагін. – Мінск, 2001. – С. 63.
- Кулагін, А.М. Царква ў гонар Ражаства Прасвятой Багародзіцы і жаночы манастыр / А.М. Кулагін // Кулагін А.М. Праваслаўныя храмы Беларусі : энцыкл. даведнік / А.М. Кулагін. – Мінск, 2007. – С. 128.
- Манастыр базыльянак / У.В. Алісейчык, А.К. Краўцэвіч, М.А. Ткачоў, І.М. Чарняўскі // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 68.
- Марціновіч, А. Жаночы манастыр Свята Раства Багародзіцы / А. Марціновіч // Горадна, Горадзен, Гродна: нарысы / аўт. тэксту А. Марціновіч, фотаздымкі А.Ласмінскага. – Мінск, 2008. – С. 52.
- Трусов, И. Г. Монастырь Рождества Богородицы / И. Г. Трусов // Трусов И. Г. Православные храмы Гродно. Краткий очерк истории / И. Г. Трусов. – Мінск, 2008. – С. 75.

- Береснева, Е. Реальный экуменизм / Е. Береснева // Рэспубліка. - 2005. -15 чэрв. - С. 10.
- Береснева, Е. Печальницы земли славянской / Е. Береснева // Рэспубліка. - 2005. - 25 мая. - С. 3.
- Тусевич, Е. Монашеская молитва объемлет Восток и Запад / Е. Тусевич // Гродзен. праўда. - 2005. - 28 мая. - С.11.
- Гавриила, иг. Женщина в монашеской келье / иг. Гавриила // Вечерний Гродно. - 2005. - 19 окт. - С. 6.

- Гавриила, иг. Печальница земли славянской : град, или весь, имеющие обитель, от зла защищены / иг. Гавриила // Гродзенская праўда. - 2006. - 19 крас. - С. 3.
- Янчевская, Ж. Свет добра, терпимости и веры / Ж.Янчевская // Гродзенская праўда. - 2006. - 28 верас. - С. 4.
- Ярошевич, А. Мудрость мира сего - это вера / А. Ярошевич // Гродзенская праўда. - 2006. - 30 снеж. - С. 4.
- Гавриила, иг. Весна души человеческой / иг. Гавриила // Гродзенская праўда. - 2007. - 17 лют. - С. 8.
- Черкес, Т. Вечерний звон / Т. Черкес // Вечерний Гродно. - 2007. - 8 авг. - С. 25.
- Гавриила, иг. Родник духовности / иг. Гавриила // Гродзенская праўда. - 2007. - 19 верас. - С.1,4.
- Янчевская, Ж. Сияло солнце над монастырем / Ж. Янчевская // Гродзенская праўда. - 2007. - 27 верас. - С. 1.
- Янчевская, Ж. Обитель веры, добра и милосердия / Ж. Янчевская // Гродзенская праўда. - 2007. - 26 верас. - С. 7.
- Семенова, Е. Обитель веры / Е. Семенова // Народная газета. - 2007. - 29 лістап. - С. 12.
- Семенова, Е. Третье возрождение обители / Е. Семенова // Союзное вече (прилож. к Нар. газ). - 2007. - 25 кастр. - С. 6.
- Мурина, С. Очищает и врачует. Колокольный звон имеет необычайную силу / С. Мурина // Гродзенская праўда. - 2008. - 9 студз. - С. 4.
- Гузень, Е. В Святки приглашаем на оладки / Е. Гузень // Гродзенская праўда. - 2008. - 16 студз. - С. 27.
- Зубрицкая, М. Счастлив тот, кто поделилился с ближним / М. Зубрицкая // Вечерний Гродно. - 2008. - 17 студз. - С. 6.
- Светлая, Н. И каждому воздастся по делам его... / Н. Светлая // Гродзенская праўда. - 2009. - 23 верас. - С. 3.
- Гавриила, иг. Путь очищения души : [беседа с настоятельницей Свято-Богородичного православного женского монастыря игуменьей Гавриилой] / иг. Гавриила // Гродзенская праўда. - 2009. - 30 снеж. (№151). - С.5.
- Поклонились Кресту // Гродзенская праўда. - 2009. - 27 чэрв. - С.4.
- Дубравина, А. Мир несущие / А. Дубравина // Перспектива. - 2009. - 6 мая. - С. 4.
- Зубрицкая, М. "Христос родился и в нас воплотился!" / М. Зубрицкая // Милицейский вестник. - 2010. - 21 студз. - С. 21.
- Светлая, Н. Святки - это свято / Н. Светлая // Гродзенская праўда. -2010. - 14 студз. - С. 8.
- Светлая, Н. Обитель Веры и Добра // Гродзенская праўда. - 2011. - 22 вер. - С. 4.

- Гавриила, иг. Бытие Обители : [о Свято-Богородичном православном женском монастыре] // Гродзенская праўда. - 2012. - 19 вер. - С.4, 5.
- Всем верующим - отрада и утешение : [к 20-летию возрождения Свято-Рождество-Богородичного православного женского монастыря] // Гродзенская праўда. - 2012. - 26 вер. - С. 4.
- Чарава, К. Адроджаны манастыр : [пра Свята-Раства-Багародзіцкі манастыр у Гродне і яго настаяцельніцу іг. Гаўрыілу] // Беларусь. - 2013. - № 1. - С. 7.

## Гродзенскі Свята-Пакроўскі кафедральны сабор



Помнік архітэктуры пач. XX ст. Пабудаваны ў Гродне (вул. Ажэшкі, 23) у псеўдарускім стылі на ўшанаванне памяці афіцэраў і ніжніх чыноў 26-й артылерыйскай брыгады, якія загінулі ў руска-японскую вайну 1904 – 05 гг. Мураваная 12-калонная 3-нефавая базіліка. Над прытворам 10-метровая 8-гранная званіца, накрытая шатром, завершаным цыбулепадобным купалком на барабане. Абапал званіцы – невялікія шатры з купаламі. Над алтарнай апсідай 5 цыбулепадобных купалоў на 8-гранных барабанах з несапраўднымі вокнамі (блендамі), завершанымі какошнікамі. Над рызніцай – 2 шатры з макаўкамі. Галоўны фасад храма сіметрычны. Вокны паўцыркульныя з какошнікамі. Перад уваходамі – высокія ганкі, упрыгожаныя разнымі 3-вугольнымі навісямі і калонкамі. Бабінец перакрыты высокімі крыжовымі скляпеннямі, мае мазаічную падлогу.

Плоская столь асноўнага аб’ёму ўпрыгожана 3 размаляванымі плафонамі, сцены – магутным карнізам з сухарыкамі. Інтэр’ер аздоблены разным драўляным алтаром, размалёўкай.

Сабор дзейнічае. З лютага 1992 г. сабор зноў стаў Кафедральным для адроджанай Гродзенскай епархіі. У канцы 2003 г. у саборы пачаліся рэстаўрацыйныя работы. Помнік рэспубліканскага значэння.

**Бібліяграфія**


- Гродненский Свято-Покровский кафедральный собор // Туристская энциклопедия Беларуси / редкол.: Г.П. Пашков [и др.]; под общ. ред. И.И. Пирожника. – Мінск, 2007. – 162.
- Забудова вуліцы Ажэшка. Дом № 23, Пакроўская царква / С.Г. Багласаў, А.Ю. Пятросава, Э.М. Савіцкі, Т.І. Чарняўская // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 56.
- Калнін, В.В. Пакроўскі кафедральны сабор / В.В. Калнін // Калнін В.В. Гродна ў дыялогу стагоддзяў : фотаальбом / В.В. Калнін. – Мінск, 2008. – С. 117.
- Кулагін, А.М. Кафедральны сабор у гонар Пакрава Прасвятой Багародзіцы / А.М. Кулагін // Кулагін А.М. Праваслаўныя храмы Беларусі : энцыкл. даведнік / А.М. Кулагін. – Мінск, 2007. – С. 126.
- Кулагін, А.М. Свята-Пакроўскі кафедральны сабор / А.М. Кулагін // Кулагін А.М. Праваслаўныя храмы на Беларусі : энцыкл. даведнік / А.М. Кулагін. – Мінск, 2001. – С. 63.
- Марціновіч, А. Свята-Пакроўскі сабор / А. Марціновіч // Горадна, Горадзен, Гродна : нарысы / аўт. тэксту А.Марціновіч, фотаздымкі А.Ласмінскага. – Мінск, 2008. – С. 56.
- Пятросава, А.Ю. Гродзенская Пакроўская царква / А.Ю. Пятросава // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. - Т. 5. – С. 428.
- Пятросава, А.Ю. Гродзенская Пакроўская царква / А.Ю. Пятросава // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 169.
- Пятросава, А.Ю. Гродзенская Пакроўская царква / А.Ю. Пятросава // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 181.
- Трусов, И. Г. Свято-Покровский собор / И. Г. Трусов // Трусов И. Г. Православные храмы Гродно: краткий очерк истории / И. Г. Трусов. – Мінск, 2008. – С. 83.

- Ноздрин, А. Малиновый звон на заре / А. Ноздрин // Перспектива. -2006. - 3 жн. - С. 18.
- Семенова, Е. Вековой храм гродненской земли / Е. Семенова // Гродзенская праўда. - 2006. - 20 крас. - С. 4.
- Янчевская, Ж. Колокола служат века / Ж. Янчевская // Гродзенская праўда. - 2006. - 7 снеж. - С. 5.
- Гамина, В. Молитва звонаря Юли / В. Гамина // Перспектива. - 2006. - 21 дек. - С. 5.
- Бондаренко, А. Музыка как проповедь / А. Бондаренко // Милицейский вестник. - 2007. - 27 дек. - С. 22.
- Ворон, Л. Под звон колоколов / Л. Ворон // Милицейский вестник. - 2007. - 29 нояб. - С.6.

- Гамина, В. Сияние 100-летнего храма / В. Гамина // Перспектива. - 2007. – 11 окт. - С. 3.
- Черепица, В. Гродненский Свято-Покровский собор - храм-памятник / В. Черепица // Гродненские епархиальные ведомости. - 2007. - № 10. - С. 5 - 8.
- Черкес, Т. Кафедральному собору - 100 лет / Т. Черкес // Вечерний Гродно. - 2007. - 17 окт. - С. 2.
- Гостилович, Т. Благолепен храм столетний / Т. Гостилович // Гродзенская праўда. - 2007. - 17 окт. - С.1, 2.
- Беларусь православная // Гродзенская праўда. - 2007. - 15 лістап. - С. 4.
- Духовно-просветильская ярмарка "Беларусь православная" // Гродненские епархиальные ведомости. - 2007. - № 12. - С. 5.
- Дужик, И. Выбор отца Александра / И. Дужик // Гродзенская праўда. -2007. - 15 снеж. - С. 5.
- Ноздрин, А. "Все мы тянем общий возок..." / А. Ноздрин // Гродненские епархиальные ведомости. - 2007. - № 10. - С. 10 - 13.
- Середа, Р. Церковь земная / Р. Середа // Гродзенская праўда. - 2007. - 14 крас. - С. 4 - 5.
- Бондаренко, А. Души его родник...от сердца к сердцу тайный проводник / А. Бондаренко // Гродзенская праўда. - 2008. - 10 студз. - С.5.
- Страшынская, А. ...А пагоркі маўчаць / А. Страшынская // Літаратура і мастацтва. - 2008. - 17 кастр. (№42). - С. 12.
- Янчевская, Ж. Под покровом Пресвятой Богородицы / Ж. Янчевская // Гродзенская праўда. - 2010. - 26 мая. - С. 8.
- Бронзавая скульптура Божай Маці будзе адкрыта ў Гродне 14 кастрычніка // Звязда. - 2010. - 12 кастр. - С. 6.
- Романюк, Н. Вознеслась над суетой / Н. Романюк // Перспектива. - 2010. - 13 окт. - С. 5.
- Новицкая, Л. Под покровом Богородицы : о скульптуре Владимира Пантелеева "Покров Пресвятой Богородицы" возле Свято-Покровского кафедрального собора в Гродн / Л. Новицкая // Рэспубліка. - 2010. - 15 кастр. (№197). - С. 3.
- Василевкина, Т. Святой дар / Т. Василевкина // Гродзенская праўда. - 2010. - 8 снеж. - С. 4.
- В Гродно установлена скульптура "Покров Пресвятой Богородицы" // Гродненские епархиальные ведомости. - 2010. - № 11. - С. 7.
- Собору подарили скульптуру Богородицы // Вечерний Гродно. - 2010. - 13 окт. - С. 2.
- Новицкая, Л. Богородица приземлилась в Городне / Л. Новицкая // Рэспубліка. - 2010. - 13 кастр. - С. 23.
- Антонова, А. Молитва звонящего: о звонаре Свято-Покровского кафедрального собора Юлии Минченко / А. Антонова // Гродзенская праўда. - 2012. - 6 студз. - С. 1.

- Саласюк, В. Им голос был : [о хоре Гродн. Свято-Покровского собора] // Перспектива. - 2013. - 15 февр. - С. 7.

## Гродзенскі Стары замак



Комплекс абарончых пабудоў, культавых і свецкіх будынкаў XI – XIX ст. Узнік як умацаваны дзядзінец на высокім берагавым мысе каля ўпадзення р. Гараднічанкі ў р. Нёман, на месцы паселішча XI ст. Стаў умацаваным цэнтрам старажытнай Гародні. Па краях замкавага пагорка быў узведзены шырокі (да 15 м.) і высокі абарончы вал з пяску, культ. пласта і суглінку. У сярэдзіне для трываласці былі закладзены дубовыя і сасновыя бярвёны, а вонкавы схіл выкладзены камянямі. Па версе вала праходзілі драўляныя сцены-гародні з баявой галерэяй. Ад узвышша з боку поля замак аддзяляў глыбокі яр. У пач. XII ст. крэпасць ператварылася ў княжацкую рэзідэнцыю (замак), цэнтр удзельнага княства. На беразе Нёмана быў пабудаваны 2-павярховы Гродзенскі княжацкі хорам, у цэнтры замка ўзведзена багата аздобленая Ніжняя царква. Тэрыторыя вакол царквы забудоўвалася драўлянымі будынкамі. Месцазнаходжанне царквы вызначала арыентацыю вуліц: адна праходзіла з поўначы на поўдзень, другая з захаду на ўсход. Брама знаходзілася ва ўсходняй частцы замка. Як сведчыць Іпацьеўскі летапіс, у 2-й пал. XIII ст. замак меў рубленыя сцены з бярвён з прыкрытымі брустверамі баявымі пляцоўкамі. Подступы да брамы абараняла высокая круглая ў плане каменая вежа т. зв. Валынскага тыпу (“столп”). У XIV ст. на руінах згарэлай у 1183 г. Ніжняй царквы пабудаваны невялікі квадратны ў плане храм з адной апсідай – Верхняя царква. Пасля пажару ў 1398 г. вялікі князь Вітаўт пабудаваў з каменю і цэглы (цэглай выраўноўваліся рады валуноў і абмуроўваліся вежы) гатычны 5-вежавы Верхні замак (пазней названы Старым). Па перыметры замкавай гары былі ўзведзены сцены шыр. 2,5 – 3 м. і 4 квадратныя вежы (пятай вежай з’яўляўся, напэўна, “столп”). Над ровам, які аддзяляў замак ад горада, стаяла ўязная вежа з пад’ёмным драўляным мостам, які злучаў замак з Гродзенскім Ніжнім замкам.

Другая вежа знаходзілася на беразе Нёмана, 3-я – на мысе Гараднічанкі, 4-я – ў паўночна-ўсходнім куце. Паміж паўночна-ўсходняй і круглай вежамі знаходзіўся 2-павярховы палац, сцяна якога

адначасова з’яўлялася і сцяной замка. У 1580 г. палац перабудаваны для караля Рэчы Паспалітай Стэфана Баторыя па праекце італьянскага арх. Скота з Пармы.

Рэнесансны палац (60x21 м.) быў увянчаны дэкаратыўным абарончым атыкам, упрыгожаным аркамі з фігурнымі завяршэнямі і тонкай аздобай акон. Фасады палаца і асабліва плоскасці франтонаў былі арнаментаваныя сграфіта і разьбой. 1-ы паверх меў скляпеністыя перакрыцці, тут знаходзілася канцылярыя, архіў, скарбніца, кладоўка і вартоўня. Тронная зала і каралеўскія пакоі на 2-м паверсе былі аздоблены шліфаваным гіпсам, кафляй і разьбой; падлога выкладзена керамічнымі пліткамі і мармурам. У сярэдзіне XVII ст. разбураны, адноўлены ў 1678 г. У XVIII – XIX ст. была зроблена надбудова 3-га паверха, павялічаны аконныя праёмы, што змяніла аблічча палаца. У 1920 – 30-я гады ў замку знаходзіўся музей. На тэрыторыі комплекса неаднаразова праводзіліся архітэктурна-археалагічныя даследаванні, выкананы шэраг работ па кансервацыі і рэстаўрацыі розных элементаў XIV - XVI ст. Цяпер у будынку размешчаны Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей. Распрацоўваюцца праекты і вядуцца спрэчкі наконт рэстўрацыі комплекса і звароту яму першапачатковага выгляду.

**Бібліяграфія**


- Аляксееў, Л.В. Гара “Стары замак” / Л.В. Аляксееў // Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі Панямоння / Л.В. Аляксееў. – Мінск, 1996. – С. 15.
- Гродзенскі Стары замак // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. - Т. 5. – С. 438.
- Гродзенскі Стары замак. XVI ст. Макет // Бохан Ю. Побыт феадалаў Вялікага Княства Літоўскага ў XV - сярэдзіне XVII стагоддзя / Ю, Бохан. - Мінск, 2011.- С. 51.
- Гродненский Старый замок // Города, местечки и замки Великого княжества Литовского : энциклопедия / ред. совет: Т. В. Белова и др. – Мінск, 2009. – С. 126.
- Гродненский старый замок // Туристская энциклопедия Беларуси / редкол.: Г.П. Пашков [и др.]; под общ. ред. И.И. Пирожника. – Минск, 2007. – С. 162.
- Звяруга, Я.Г. Гродзенскі Стары замак / Я.Г. Звяруга, А.А. Трусаў Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 181.
- Кишик, Ю.Н. Сеть композиционно-видовых связей. Начало XX века / Ю.Н. Кишик // Кишик, Ю.Н. Градостроительное наследие Беларуси. Гродно / Ю.Н. Кишик. - Минск, 2012.- С. 188 - 217.
- Сардаров, А.С. [Мост между Старым и Новым замками в Гродно] / А.С. Сардаров // Сардаров А.С. Путетворение : история и культура белорусских дорог. - Минск, 2009. - С. 136 - 137.
- Стары замак / У.В. Алісейчык, Я.Г. Звяруга, А.К. Краўцэвіч, М.А. Ткачоў, А.А. Трусаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі.

Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 78.

- Ткачоў, М. Гродзенскі Стары замак / М. Ткачоў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / гал. рэд. Г.П. Пашкоў. – Мінск, 1996. – Т. 3. – С. 141.
- Ткачоў, М. Гродзенскі Стары замак / М.Ткачоў // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. / рэдкл.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 191.
- Трусаў, А.А. Стары замак у Гродне XI – XVIII ст.ст. : гіст.-архітэктурны нарыс / А.А. Трусаў, В.Е. Собаль, Н.І. Здановіч. – Мінск, 1993. – 152 с. : іл.
- Трусов, И. Г. Гродненские архитекторы и строители 12 – 18 веков / И.Г. Трусов. – Гродно : ЮрСаПринт, 2012 – 72 с. : ил.
- Чантурыя, У.А. Гродзенскі Стары замак / У.А. Чантурыя // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 197.
- Шимко, Л.В. Замковые сооружения Беларуси XIV - XVII вв. : [реферат] / Л.В. Шимко. - Гродно, 2011. – С.20 – 22.

- Янчевская, Ж. Перекрестки судьбы, профессии, любви / Ж. Янчевская // Гродзенская праўда. - 2007. - 10 марта. - С. 5.
- Кавеліч, В. Да пары церпяць час муры / В. Кавеліч // Гродзенская праўда. - 2007. - 25 крас. - С. 6.
- Островцова, И. Старый замок отреставрируют / И. Островцова // Вечерний Гродно. - 2007. - 12 сент. - С. 6.
- Попко, И. В поисках утраченного / И. Попко // Советская Белоруссия. - 2007. - 19 окт. - С. 16.
- Островцова, И. В Старом замке будет баня / И. Островцова // Вечерний Гродно. - 2008. - 6 авг. - С. 10.
- Лободенко, Г. На гродненских стройках находят мечи XVI века / Г. Лободенко // Комсомольская правда в Белоруссии. - 2008. - 14 - 20 авг. - С. 33.
- Новицкая, Л. Ренесанс Старого замка / Л. Новицкая // Рэспубліка. - 2008. - 9 кастр. - С. 4.
- Черкес, Т. Где живут привидения / Т. Черкес // Вечерний Гродно. - 2008. - 17 дек. - С. 31.
- Васильева, Т. Архитектурные сокровища ждут своего часа : Старый замок в Гродно / Т. Васильева // Обозреватель. - 2009. - 23 янв. - С.28.
- Вишневская, Т. Станет ли Старый замок новым / Т. Вишневская // Перспектива. - 2009 - 25 янв. - С. 8.
- Ивановский, В. Символ, плененный временем / В. Ивановский // Перспектива. - 2009. - 18 февр. - С. 26.
- Ивановский, В. Символ, плененный временем / В. Ивановский // Перспектива. - 2009. - 25 февр. - С. 26.

- Корбут, В. Будзе і ў нас свой Крэмль! / В. Корбут // Народная газета.- 2009. - 21 лют. - С. 14.
- Маслякова, А. Каким будет Старый замок / А. Маслякова // Знамя юности. - 2009. - 23 янв. - С. 28.
- Мілеўская, Н. Крок у сярэдневякоўе / Н. Мілеўская // Перспектива. -2009. - 11 нояб. - С. 5
- Пракопчык, Б. Зроблена нашымі продкамі / Б. Пракопчык // Звязда. - 2009. - 5 снеж. - С. 6.
- Приходько, Л. Каким будет Старый замок / Л. Приходько // Знамя юности. - 2009. - 23 - 29 янв. - С. 28.
- Зубрыцкая, М. Кніга на сценах / М. Зубрыцкая // Милицейский вестник. - 2009. - 19 нояб. - С. 20.
- Шлык, Н. С века 12 в век 21 / Н. Шлык // Гродзенская праўда. - 2009. - 31 снеж. - С.1,4.
- Вашкевич, А. Замок на ладони / А. Вашкевич // Гродзенская праўда. - 2011. - 2 сак. - С.11.
- Ушкевич, П. Под сенью королевского замка / П. Ушкевич // Перспектива. - 2011. -12 авг. - С. 6.
- Швед, В. Вялікакняжацкія палаты : пра Стары замак у Гродне // Гродзенская праўда. - 2012. - 11 студз. - С. 8.
- Синевич, А. Дворцовый переворот : как будут спасать наши замки : [о замках Гродненской обл, в т. ч. Старом замке в Гродно] // Вечерний Гродно. - 2012. - 18 янв. - С. 12.
- Кушнярэвіч, А. Усходнеславянскія вежы - "стаўпы" ў еўрапейскім архітэктурным кантэксце // Беларускі гістарычны часопіс. - 2012. - № 1. - С. 5 - 10.
- Вашкевич, А. Верхняя церковь в Старом замке : об одноим. архитектурном памятнике в рамках проекта "Веч. Гродно" "Красная книга Гродно" по сохранению материалов о зданиях и уголках Гродно, которым грозит исчезновение / А. Вашкевич // Вечерний Гродно. - 2012. - 22 февр. - С. 8.
- Чарняўскі, І. Стары замак у новым часе : [гутарка з нач. упр. па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры РБ І. Чарняўскім пра Стары замак у Гродне] / гутар. Ірына Тулупава // Літаратура і мастацтва. - 2011. - 13 мая. - С. 13.
- Саяпин, В. Из рук в руки : история Гродно на страницах газет. 1927 год / В. Саяпин // Перспектива. - 2012. - 22 августа. - С. 22.

## Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра будынак

Узведзены ў 1977 – 84 гг.(арх. Г. Мачульскі) з цэглы і зборнага жалезабетону. Складаецца з асноўнага аб’ёму (з гал. глядзельнай залай і фае) і П-падобнага ў плане 3-павярховага адміністрацыйна-службовага корпуса. У агульнай кампазіцыі дамінуе 6-гранны асноўны аб’ём, вуглы якога вылучаны ўвагнутымі вертыкальнымі пілонамі, што

выступаюць над дахам. Рытм вузкіх вертыкальных рэбраў паміж пілонамі кантрастуе з паўкруглымі лініямі буйных зашклёных канструкцый фасадаў на ўзроўні 1-га і 2-га паверхаў, што надае



дынамічнасць будынку. У завяршэнні па перыметру будынка праходзіць хвалістая стужка парапета. Цэнтральны ўваход вылучаны пластычна выгнутымі сценкамі і каскадам лесвіц; на ім размешчана 3-фігурная кампазіцыя "Пегас" (скульптар Л. Зільбер; медзь, выбіванне, выш. каля 8 м.). Спрошчаны аб'ём службовага корпуса ўзбагачаны вуглавымі лесвічнымі клеткамі. Фасады абліцаваны светлай пліткай, цагляная муроўка нішаў і баразён ствараюць уражанне лёгкасці. Архітэктуру будынка дапаўняюць басейн з фантанам, дэкаратыўныя ліхтары, падпорныя сценкі, каскады лесвіц.

Галоўная глядзельная зала (на 700 месцаў) вырашана амфітэатрам з балконам, аздоблена драўлянымі панелямі, кесаніраванай акустычнай падвеснай столлю, дэкаратыўнай тынкоўкай. Беламармуровыя бакавыя лесвіцы злучаюць вестыбюль з 2-светлавым фае і бакавымі кулуарамі. Сцены вестыбюля абліцаваны светла-шэрым мармурам. Сцены фае апрацаваны светлай рыфлёнай тынкоўкай, са столі звісае вялікая люстра з рыфлёнага белага нёманскага шкла. На франтальнай сцяне аб'ёмнае скульптурнае пано (мастакі І. Пчэльнікаў, І. Лаўрова), прысвечанае тэатральнаму мастацтву. У яго верхняй частцы кампазіцыі з гісторыі тэатра: "Народны тэатр", "Класіка", "Тэатр рэвалюцыі", "Новы тэатр" і "Тэатр, які аб'ядноўвае ўсе мастацтвы".

Ніжэй на пастаментах устаноўлены бюсты А.Пушкіна, У.Шэкспіра, і Мальера, паміж імі плакеткі з выявамі дзеячаў беларускай культуры – М.Гусоўскага, Ф.Скарыны, Я.Купалы і Я.Коласа. На сценах кулуараў і над уваходамі ў партэр – скульптурна-жывапісныя кампазіцыі "Антычная тагедыя", "Дыянісава шэсце", "Батлейка", "Скамарохі". Малая глядзельная зала (на 200 месцаў) размешчана на 1-м паверсе адміністрацыйна-службовага корпуса, мае кулуары з буфетам, вестыбюль і фае. У цокальным паверсе – рэпетыцыйная зала, артыстычныя пакоі, апаратная, склады аб'ёмных дэкарацый. Будынак – узор арганічнага сінтэзу архітэктуры з манументальна-выяўленчым мастацтвам.

**Бібліяграфія**

- Гродзенскі абласны драматычны тэатр // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. - Т. 5. – С. 429.
- Гродненский областной драматический театр // Туристская энциклопедия Беларуси / редкол.: Г.П. Пашков [и др.]; под общ. ред. И.И. Пирожника. – Минск, 2007. – С. 159.
- Кулагін, А.М. Будынак абласнога драматычнага тэатра / А.М. Кулагін // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 46.
- Кулагін, А.М. Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра будынак / А.М. Кулагін // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 162.
- Лабовіч, А.А. Гродзенскі абласны драматычны тэатр / А.А. Лабовіч, А.М. Кулагін // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 182.

## Гродзенскага акруговага шпіталя будынак



Помнік грамадзянскай архітэктуры XIX ст. Узнікненне шпіталя ў Гродне звязана з дзейнасцю ордэна ксяндзоў Баніфратараў, які ў канцы XVIII ст. меў драўляны будынак шпіталю на вул. Баніфратарскай (сучас. вул. Свярдлова). У пачатку 1840-х гг. шпіталь размяшчаўся ў мураваным 2-павярховым будынку бровара Баніфратараў па вул. Верцялішскай (сучас. вул. Ажэшкі, 9). Пасля скасавання ордэна гэты будынак перададзены Прыказу грамадскага апекавання для размяшчэння акруговага шпіталя (лячэбніцы). У 1857 г. пад наглядам губернскага арх. В. Міхаэліса будынак перабудаваў і адрамантаваў купец Я.Фрумкін, стаў яго ўладальнікам і заключыў кантракт на 30 гадоў пра здачу будынка ў арэнду пад акруговы шпіталь.

У 1981 г. Гродзенская гар. ўправа зацвердзіла план перабудовы будынка. У такім выглядзе ен захаваўся да нашага часу. Прамавугольны ў плане 2-павярховы будынак з цокальным паверхам. Сіметрычна-восевая кампазіцыя галоўнага фасада падкрэслена 3 рызалітамі, завершанымі фігурнымі атыкамі. 2-ярусная арганізацыя фасада падкрэслена міжпаверхавым і завяршальным карнізамі з фігурнымі арнаментаванымі кранштэйнамі.

Прамавугольныя і паўцыркульныя аконныя праёмы ўпрыгожаны ліштвамі з сандрыкамі, франтончыкамі і філёнгамі. Цокаль і першы паверх апрацаваны рустам.

Галоўны фасад меў на 2-м паверсе 3 літыя балконы. У аперацыйнай зале ў сярэдзіне асноўнага аб'ёму быў купал. Да будынка дабудаваны два аднапавярховыя флігелі.

Са снежня 1902 г. ў будынку б. акруговага шпіталя размяшчаліся акруговая ўправа і паштова-тэлеграфная кантора з кватэрамі для службоўцаў. У 2-й палове XX ст. з гал. фасада зняты балконы, ліквідваны купал, зменена ўнутраная планіроўка, люкарна на цэнтр. атыку закрыта абстрактнай выявай.

**Бібліяграфія**


- Акінчыц, Р.М. Гродзенскага акруговага шпіталя будынак / Р.М. Акінчыц // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 163.
- Акінчыц, Р.М. Гродзенскага акруговага шпіталя будынак / Р.М. Акінчыц // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. - Т. 5. – С. 419.


## Гродзенскага акруговага суда будынак



Вул. Савецкая, 31. Помнік эклектычнай архіэктуры. Пабудаваны ў 1884 г. з цэглы. Выцягнуты ўздоўж лініі вуліцы 3-павярховы будынак

на высокім цокалі, да якога з паўднёвага боку прымыкае 2-павярховае крыло.

Першапачатковую сіметрычную кампазіцыю будынка парушыла надбудова 3-га паверха ў 1910 г. Паўночная частка будынка ўяўляе сабой перабудаванае крыло б. палаца Масальскіх (гл. *Гродзенскага паштовага ведамства будынак*).

Фасад рытмічна расчлянёны прамавугольнымі аконнымі праёмамі ў разнастайных ліштвах з замковым каменем на 1-м, лучковымі франтонамі на 2-м і сандрыкамі на 3-м паверхах. Насычаны архітэктурна-пластычны дэкор уключае руст, прафіляваныя філенгі з гірляндамі, лучковыя сандрыкі, арнаментальныя паясы меандра і дубовых галінак.

Па баках фасада над прафіляваным карнізам з сухарыкамі пастаўлены лучковы і прамавугольны атыкі. Бакавы ўваход вылучаны неглыбокім рызалітам з балконам. На дваровым фасадзе выступаюць глыбокія рызаліты лесвічнай клеткі і тарцовых залаў, аб’яднаных памяшканнямі з калідорнай планіроўкай. Пад значнай часткай будынка выяўлены крыжовыя скляпенні XVIII ст. У 1987 г. сіламі Гродзенскай абл. комплекснай праектнай майстэрні ін-та “Белспецпраектрэстаўрацыя” быў распрацаваны праект рэстаўрацыі фасадаў будынка (С. Шэйко, І. Трусаў).

**Бібліяграфія**


- Ватковіч, Г.Б. Будынак акруговага суда / Г.Б. Ватковіч, А.М. Кулагін // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 48.
- Кулагін, А.М. Гродзенскага акруговага суда будынак / А.М. Кулагін, І.Г. Трусаў // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 162.
- Кулагін, А.М. Гродзенскага акруговага суда будынак / А.М. Кулагін, І.Г. Трусаў // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. -Т. 5. – С. 419.


## Гродзенскага пазямельна-сялянскага банка будынак

Помнік грамадзянскай архітэктуры пач. XX ст. Пабудаваны ў 1913 г. ў цэнтральнай частцы Гродна (на рагу сучасных вул. Леніна і Карбышава) паводле праекта архітэктара Б. Астравумава. Мае рысы стылю мадэрн. 2-павярховы Г-падобны ў плане мураваны будынак накрыты высокім 2-схільным чарапічным дахам з купалам у месцы злучэння аб’ёмаў. У дэкаратыўным вырашэнні фасадаў выкарыстана спалучэнне адкрытага муру з жоўтай цэглы і белых ляпных дэталяў. Будынак аздабляюць каваныя агароджы балконаў, унутранай лесвіцы, навес над уваходам. Першапачатковая калідорная планіроўка зменена.

У цокальным паверсе размяшчаліся архіў і службовыя памяшканні, на 1-м – вестыбюль і службовыя пакоі, на 2-м – аперацыйная зала і кватэры адміністрацыі. Выкарыстоўваецца як адміністрацыйны будынак.

**Бібліяграфія**


- Чарнатаў, В.М. Будынак сялянскага пазямельнага банка / В.М. Чарнатаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 49.
- Чарнатаў, В.М. Гродзенскага пазямельна-сялянскага банка будынак / В.М. Чарнатаў // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т./ гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 175.
- Чарнатаў, В.М. Гродзенскага пазямельна-сялянскага банка будынак / В.М. Чарнатаў // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 163.
- Чарнатаў, В.М. Гродзенскага пазямельна-сялянскага банка будынак / В.М. Чарнатаў // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. - Т. 5. – С. 420.


## Гродзенскага паштовага ведамства будынак

Помнік архітэктуры XVIII – XIX ст. Пабудаваны ў Гродне (сучасная вул. Ажэшкі, 1) як палац князёў Масальскіх. Моцна пашкоджаны пажарамі ў 1753 і 1782 гг. Каля 1795 г. перабудаваны ў стылі класіцызму. Паміж 1831 – 43 гг. выкуплены купцом Фрумкіным, сям'і якога належаў да 1939 г. У 1843 – 1903 гг. арандатарам будынка было паштовае ведамства (адсюль і назва). Спачатку 2-х павярховы П-падобны будынак з сутарэннямі накрыты 2-х схільным дахам з марсэльскай дахоўкі.



Сіметрычная кампазіцыя галоўнага фасада чляніласа на тры ярусы, аддзеленыя карнізамі. Вокны верхняга яруса, які завяршаўся прафіляваным карнізам, былі багата дэкарыраваныя сандрыкамі, ліштвамі і франтонамі. У цэнтральнай частцы будынка знаходзіўся арачны праезд, вылучаны трохвугольным франтонам і 4 пілястрамі. У XIX ст. будынак неаднаразова рамантаваўся, у 1860-х гадах марсельская дахоўка была зменена на

бляху, на фасадзе зроблены 2 балконы – адзін над праездам, другі на рагу будынка (не захаваўся). У 1884 г. да крыла пошты з боку вул. Саборнай (суч. вул. Савецкая) быў дабудаваны *Гродзенскага акруговага суда будынак* пры гэтым частка будынка ўвайшла ў агульную кампазіцыю і атрымала эклектычны дэкор. У 1987 г.распрацаваны праект рэстаўрацыі будынка (арх. С. Шэйко).

**Бібліяграфія**


- Забудова вуліцы Ажэшка. Дом №1 / С.Г. Багласаў, А.Ю. Пятросава, Э.М. Савіцкі, Т.І. Чарняўская // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 57.
- Трусаў, І. Г. Гродзенскага паштовага ведамства будынак / І.Г. Трусаў // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 163.


## Гродзенскага рэальнага вучылішча будынак



Помнік грамадзянскай архітэктуры пач. XX ст. Пабудаваны ў Гродне (суч. вул. 1 Мая, 3) у 1907 г. у стылі неакласіцызму. У 1920 – 30 гг. ў будынку размяшчалася гімназія імя А.Міцкевіча. Мураваны 2-павярховы атынкаваны будынак мае ў плане складаную, блізкую да Г-падобнай форму. Падзелены на блокі: вучэбны і грамадскага прызначэння. Вучэбны блок - выцягнуты ўздоўж вуліцы 1 Мая. Выразнасць галоўнага фасада дасягаецца строгім рытмам аконных праёмаў. Размяшчэнне класных пакояў аднабаковае. Шырокі светлы калідор, у тарцах якога знаходзяцца 2 лесвічныя клеткі, выконвае ролю аб’яднальнага звяна. Перпендыкулярна да вучэбнага пастаўлены блок грамадскага прызначэння. На яго 1-м паверсе размешчаны прасторны вестыбюль, гардэроб, адміністрацыйна-гаспадарскія памяшканні, на 2-м – актавая зала, бібліятэка, сталовая, настаўніцкія пакоі. Пры агульнай з вучэбным блокам сіметрычнай кампазіцыі архітэктурная выразнасць дасягаецца выкарыстаннем розных па прапорцыі і маштабу арачных акон. Да тарца блока грамадскага прызначэння прымыкае аб’ём, вырашаны ў адным з ім

стылявым ключы, дзе размяшчалася гімнастычная зала. Будынак выкарыстоўваецца як вучэбны корпус ГДзАУ.

**Бібліяграфія**


- Чарнатаў, В.М. Гродзенскага рэальнага вучылішча будынак / В.М. Чарнатаў // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 164.
- Самусік, А.Ф. Гродзенскае рэальнае вучылішча / А.Ф. Самусік // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. - Т. 5. – С. 420.
- Чарнатаў, В.М. Будынак рэальнага вучылішча / В.М. Чарнатаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. - С. 49.


## Гродзенскага тэатра Тызенгауза будынак



Закладзены ў 1772 г. Па ініцыятыве А.Тызенгаўза для яго тэатра, узведзены ў 1780-я гг. з цэглы (арх. І.М. Мёзер, Дж. Сака). Задуманы як працяг *Гродзенскага палаца Тызенгаўза* - злучаўся з яго левым флангам крытым пераходам. Тэатральная зала сфарміравана па “італьянскай крывой”, уяўляла сабой паўкруглае памяшканне з амфітэатрам і яруснымі галерэямі па перыметры; мела 22 ложы ў 2 ярусах, партэр і сцэну з 5 планамі кулісных машын для перамяшчэння дэкарацый. У 1859 г. пасля рэканструкцыі аб’ём будынка павялічаны, план набыў асіметрычную аб’ёмна-прасторавую кампазіцыю. У 1940 г. пабудаваны 3-ці паверх, што павялічыла аб’ём залы, у 1975 г. рэканструяваны, расшырана сцэнічная каробка і глядзельная зала. 3-павярховы будынак складанай канфігурацыі ў плане пастаўлены на высокі руставаны цокаль накрыты 4-схільным дахам. Галоўны фасад асіметрычны, падзелены карнізам на 2 часткі, апрацаваны пілястрамі.

Над уваходам у левым крыле – вялікі балкон, які падтрымліваюць 4 калоны, апрацаваныя рустам. Бакавы фасад аформлены пілястрамі, з высокімі прамавугольнымі вокнамі з сандрыкамі і трохвугольнымі франтонамі, на ўзроўні 3 паверха – дэкаратыўныя люкарны. Завяршаюць сцены карнізы з сухарыкамі. Правая частка будынка – прамавугольны ў плане аб'ём сцэнічнай каробкі. Глядзельная зала знаходзіцца на ўзроўні 1-га і 2-га паверхаў, асвятляецца з аднаго боку натуральным святлом. На 1-м паверсе таксама размешчаны невялікае фае і службовыя памяшканні, на 2-м – рэпетыцыйны пакой, грымёрныя. З партэра і фае на балкон вядуць лесвіцы. Будынак выкарыстоўваецца як тэатральнае памяшканне. У ім працавалі: 1778 – 80 гг. – тэатр Тызенгаўза (па звестках І.Бернулі); 1802 – 09 гг. - С. Дэшнер; 1846 – 54 гг. – пастаянны дырэкцыйны руска-польскі тэатр; польскі ім. Э.Ажэшкі (з 1921 наз. Гарадскі польскі, у 1928 – 39 гг. - ім. Э. Ажэшкі); 1940-41 гг. – Дзярж. Польскі тэатр БССР пад кіраўніцтвам А.Вянгеркі і вандроўны Дзярж. Польскі тэатр лялек БССР; 1945 – 47 гг. – Дзярж. Рускі драматычны тэатр БССР; з 1947 г. – абл. Драматычны тэатр; з 1984 г. працуе Гродзенскі абл. Драматычны тэатр лялек. У будынку праходзілі: 1-е пасяджэнне Гродзен. Савета рабочых дэпутатаў (26.1.1919 г.) і 1-я сесія Гродзенскага гар. Савета дэпутатаў працоўных (25.1.1940 г.)

**Бібліяграфія**


- Барышаў, Г. Гродзенскі тэатр Тызенгаўза / Г. Барышаў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / гал. рэд. Г.П. Пашкоў. – Мінск, 1996. – Т. 3. – С. 142.
- Барышаў, Г. Гродзенскі тэатр Тызенгаўза / Г. Барышаў // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 197.
- Барышаў, Г. Гродзенскі тэатр Тызенгаўза / Г. Барышаў, С.Я. Сільверстава, А.Ю. Пятросава // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. - Т. 5. – С. 439.
- Пятросава, А.Ю. Будынак тэатра Тызенгаўза / А.Ю. Пятросава, Э.М. Савіцкі, Г.І. Барышаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 49.
- Сільверстава, С.Я. Гродзенскага тэатра Тызенгаўза будынак / С.Я. Сільверстава, А.Ю. Пятросава // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 164.

- Кавеліч, В. Флігель Тызенгаўза / В. Кавеліч // Гродзенская праўда. -2006. - 22 сак. - С. 8.

- Маліноўскі, М. Прыгонная славутасць / М. Маліноўскі // Культура. - 2007. - № 44 (3 - 9 ліст.). - С. 14.
- Новицкая, Л. Театр, который смотрит в завтра / Л. Новицкая // Рэспубліка. - 2007. - 1 нояб. - С. 8.
- Игнатенко, А. Куклы в ожидании переезда / А. Игнатенко // Гродзенская праўда. - 2011. - 23 нояб. - С. 29.
- Саяпин, В. История Гроденского театра кукол / В. Саяпин // Саяпин, В. Гродно: театр, кино, цирк / В. Саяпин.- Гродно, 2011. - С. 6 - 22.
- Жюгжда, О. Актеры бьют тревогу. Реконструкция может нарушить акустику старейшего театра : [беседа с гл. реж. Гродн. театра кукол О.Жюгждой] // Вечерний Гродно. - 2012. - 29 февр. - С.1, 3.
- Антонова, А. Антракт не затянется : [о ходе реконструкции Гродн. театра кукол] // Гродзенская праўда. - 2012. - 7 сак. - С. 8.
- Отто, Э. Что будет в кукольном доме : [о ходе реконструкции Гродн. театра кукол] // Вечерний Гродно. - 2012. - 14 сак. - С. 10.
- Цыганец, В. Куклы готовятся к новоселью : [беседа с дир. Гродн. театра кукол В. Цыганец о ходе реконструкции театра] // Гродзенская праўда. - 2012. - 15 жн. - С. 32.
- Латушко, П. [Комментарий Министра культуры РБ П. Латушко о ходе реконструкции кукольного театраво время посещения Гродно] // Гродзенская праўда. - 2012. - 15 жн. - С. 32.

## Гродзенскай аптэкі (музея) будынак




Помнік архітэктуры барока. Узведзены на плошчы Рынак (цяпер пл. Савецкая), уваходзіць у комплекс *Гродзенскага касцёла і кляштара езуітаў*. У пісьмовых крыніцах упершыню ўзгадваецца ў 1687 г. (верагодна знаходзілася ў адным з пакояў старога калегіума езуітаў).

У 1709 г. на набытым у магістрата пляцы езуіты збудавалі асобны 1-павярховы аптэкарскі дом. У 1763 г. на сродкі езуіта Эдэра да яго надбудаваны другі паверх. Калідоры на ўзроўні 1-га і 2-га паверхаў звязвалі аптэку з комплексам калегіума.

Унутраны дворык і вузкі праезд аддзялялі аптэку ад касцёла. З боку плошчы праезд паміж касцёлам і аптэкай быў афармлены брамай з дубовымі весніцамі. Прамавугольны ў плане 2-павярховы будынак з

мансардай накрыты вальмавым 2-ярусным дахам (ніжні ярус – "гнуты") з хвалістай дахоўкі. Галоўны фасад завяршаўся 5-вугольным франтонам. Карніз 2-га паверха меў упрыгожанне накшталт паўцыркульнай аркі (верагодна, рэшткі франтона або шчыта 1-павярховай аптэкі 1709 г.).

Аконныя праёмы 1-га паверха былі ўпрыгожаны сандрыкамі. Вуглы 2-га аздоблены лапаткамі. З левага боку галоўнага фасада быў ганак з 4 гранітнымі прыступкамі і параднымі 2-створкавымі дзвярамі на 6 завесах. Франтон меў 3 прамавугольныя аконныя праёмы і люкарну ў верхняй частцы. На 1-м паверсе размяшчаліся 4 пакоі, кухня і калідор, перакрытыя цыліндрычнымі і крыжовымі скляпеннямі. Падлога галоўнай залы была выкладзена мармуровай пліткай, у астатніх – паркетам або дошкамі. У сценах былі нішы, якія выкарыстоўваліся як шафы (т. зв. "гачкі"). Сходы з першага паверха вялі ў склеп. На 2-м паверсе былі: 7 пакояў, сені, малая кухня, пакой для захавання "заморскіх лекаў". Столі 2-га паверха плоскія, атынкаваныя, аздобленыя лепкай і фрэскавай размалёўкай. Печы былі выкананы ў т. зв. "гродзенскім стылі", распрацаваным майстрам Якубам Роўфам..

З боку двара на ўзроўні 2-га паверха будынак меў драўляную галерэю, тыповую для архітэктуры Гродна XVIII – XIX ст. У 1773 г. будынак перададзены пад нагляд пробашча касцёла. У 1796 г., пасля далучэння Гродна да Расійскай імперыі, адабраны ў казну. У пачатку XIX ст. аптэкай валодаў правізар Адамовіч. З 1870 г. прыбытак ад яе належаў лютэранскай абшчыне. У 1885 г. будынак пашкоджаны пажарам і перабудаваны: з левага боку ўзведзены новы аб'ём з уваходам і лесвічным маршам на 2-і паверх, ліквідаваны франтон (замест яго зроблены складаны нізкі атыкавы дах, накрыты бляхай), зменена планіроўка. У выніку будынак набыў асіметрычную кампазіцыю і стаў тыповым прыкладам архітэктуры эклектыкі канца XIX ст. Галоўны фасад сучаснага будынка падзелены карнізнай цягай на 2 ярусы: ніжні з руставанымі лапаткамі і сандрыкавымі завяршэннямі акон, верхні з ажурным балконам і складаным атыкам у цэнтры, фігурнымі ліштвамі, фрызам і карнізам. Пэўны час у будынку размяшчаўся салон мэблі і Дом настаўніка. Зараз у ім размяшчаецца дзеючая аптэка і музей фармацыі.

## Бібліяграфія


- Багласаў, С.Г. Кляштар езуітаў. Будынак аптэкі / С.Г. Багласаў, М.М. Яніцкая // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 64.
- Гродзенскай аптэкі будынак // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 176.

- Гродненской аптеки здание // Туристская энциклопедия Беларуси / редкол.: Г.П. Пашков [и др.]; под общ. ред. И.И.Пирожника. – Минск, 2007. – С. 162.
- Ігнатовіч, Ф.І. Гродзенская аптэка-музей / Ф.І. Ігнатовіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш – Мінск, 1997. - Т. 5. – С. 422.
- Трусаў І. Г. Гродзенскай аптэкі будынак / І.Г. Трусаў // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 165.

- Апарина, Е. В аптеку за историей / Е. Апарина // Знамя юности. - 2005. – 11 февр. - С. 16.
- Новицкая, Л. Аптека из прошлых столетий / Л. Новицкая // Рэспубліка. - 2006. -27 верас. - С.6.
- Ивановский, В. Аттестованная веками / В.Ивановский // Перспектива. -2007. - 24 мая. - С.18.
- Карачун, Р. В аптеку - как в ... музей / Р.Карачун // Белорусская нива. - 2007. - 23 июня. - С. 16.
- Метелица, Н. Гродненская аптека-музей // Вокруг света (РБ). - 2009. - № 6. - С. 7.
- Попко, И. Впечатления по рецепту / И. Попко // Советская Белоруссия. - 2009. - 14 мая. - С. 12.
- Пракопчык, Б. Ступка з песцікам і чучала кракадзіла / Б. Пракопчык // Звязда. - 2007. - 17 мая. - С. 4.
- Радюк, Ю. Аптеке исполнилось 320 лет / Ю. Радюк // Национальная экономическая газета. - 2007. - 4 сент. - С. 24.
- Раманенка, Л. Аптэка Адамовічаў / Л. Раманенка // Культура. - 2007. - 24 лют.- 2 сак. - С. 21.
- Ткачева, В. Лавка древностей / В. Ткачева // Вечерний Гродно. - 2007. - 28 сак. - С.32.
- Сиводедова, О. Аптека откроет тайны / О. Сиводедова // Вечерний Гродно. - 2010. - 11 авг. - С. 35.
- Сяменава, А. Завецца горад каралеўскім / А. Сяменава // Народная газета. - 2010. - 3 лістап. - С. 15.
- Пякарская, Н. "Куток алхіміка" / Н. Пякарская // Культура. - 2011. - № 29, 16 ліп. - С. 14.


## Гродзенскай жаночай гімназіі будынак

Помнік архітэктуры неакласіцызму. Узведзены ў Гродне ў 1893 г. Уваходзіць у комплекс гістарычнай забудовы Гарадніцы (суч. вул. Ажэшкі, 22; да 1940-х гадоў побач з ім знаходзіўся будынак канторы А.Тызенгаўза).

Пляц пад гімназію быў выкуплены ў кн. Святаполк-Чацвярцінскага. 1894 г. у будынку была ўладкавана гімназійная царква: 3-павярховы Г-падобны ў плане мураваны будынак накрыты 2-

схільным дахам. Галоўны фасад вылучаны цэнтр. і 2 бакавымі рызалітамі. У цэнтры размешчаны чыгунны партал, адліты паводле тагачаснага будаўнічага каталога. Сцены змураваны з дэкаратыўнай жоўтай цэглы. Выразны рытм аконных праёмаў надае будынку строгі характар. Планіроўка галерэйная, з аднабаковым размяшчэннем класных пакояў. Паверхі злучаны параднай і службовай лесвіцамі. Вакол 2 лесвічных клетак – лабараторныя і тэхнічныя памяшканні. У будынку захаваліся разныя дзверы і вокны з масянжовымі прыладамі. У 1969 г. да 3-павярхвага корпуса прыбудаваны 4-павярховы. У будынку рамешчаны Гродзенскі дзяржаўны універсітэт ім. Я.Купалы. Помнік рэспубліканскага значэння.

**Бібліяграфія**




- Багласаў, С.Г. Забудова вуліцы Ажэшка. Дом №22, жаночая гімназія / С.Г. Багласаў, А.Ю. Пятросава, Э.М. Савіцкі, Т.І. Чарняўская // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 57.
- Гардзееў, Ю.М. Гродзенскай жаночай гімназіі будынак / Ю.М. Гардзееў // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 165.
- Гродненской женской гимназии здание // Туристская энциклопедия Беларуси / редкол.: Г.П. Пашков [и др.]; под общ. ред. И.И. Пирожника. – Минск, 2007. – С. 162.
- Чарнатаў, В.М. Гродзенскай жаночай гімназіі будынак / В.М. Чарнатаў // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 177.


## Гродзенскай медычнай школы будынак



Помнік архітэктуры позняга барока. Пабудаваны ў 1770-я гг. ў Гродне на тэрыторыі Гарадніцы (суч. вул. Ажэшкі, 20). Мураваны будынак мае сіметрычную кампазіцыю. Цэнтральная 3-павярховая частка накрыта вальмавым дахам. Галоўны фасад арыентаваны на

Гарадніцу, раскрапаваны па вуглах 2 вялікімі гранёнымі эркерамі, якія раней былі накрыты самкнутымі ўвагнутымі купаламі. Фасады аздоблены ордэрнай пластыкай, два ніжнія паверхі аб'яднаны пілястрамі. Па баках да асноўнага аб'ему 1-павярховыя прыбудовы з 3-схільнымі дахамі. Планіроўка калідорная, у цэнтральнай частцы з аднабаковым, у прыбудовах з 2-баковым размяшчэннем памяшканняў. Часткова перабудаваны ў XIX ст. Выкарыстоўваецца як адміністрацыйны будынак. Помнік рэспубліканскага значэння.

**Бібліяграфія**


- Гродненской медицинской школы здание // Туристская энциклопедия Беларуси / редкол.: Г.П. Пашков [и др.]; под общ. ред. И.И. Пирожника. – Минск, 2007. – С. 162.
- Забудова вуліцы Ажэшка. Дом № 20, ветэрынарная школа / С.Г. Багласаў, А.Ю. Пятросава, Э.М. Савіцкі, Т.І. Чарняўская // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 56.
- Пятросава, А.Ю. Гродзенскай медыцынскай школы будынак / А.Ю. Пятросава // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. - Т. 5. – С. 422.
- Пятросава, А.Ю. Гродзенскай медыцынскай школы будынак / А.Ю. Пятросава // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 166.
- Цішчанка, Я. Гродзенская медыцынская акадэмія / Я.Цішчанка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / гал. рэд. Г.П. Пашкоў. – Мінск, 1996. – Т. 3. – С. 128.


## Гродзенскай музычнай школы будынак (крывая афіцына)

Помнік архітэктуры позняга барока. Пабудаваны ў 1760-я гг. ў Гродне на Гарадніцы [у 1774 – 80 гг. (па іншых крыніцах да 1769 г.) тут працавала музычная школа, створаная А.Тызенгаўзам]. Кампазіцыйна завяршаў б. Палацавую пл. (зараз пл. Тызенгаўза). Мураваны, крывалінейны ў плане, што было абумоўлена своеасаблівасцю архітэктурнага ансамбля плошчы (адсюль назва “крывая афіцына”), накрыты складаным двухярусным дахам.

Спачатку 2-павярховы з мансардай; 1 паверх на галоўным фасадзе ўвагнутага боку меў адкрытую галерэю з аркадай, з якога 3 уваходы вялі ў класы на 1-м і 2-м паверхах. У мансардзе аналагічнай планіроўкі жылі навучэнцы і настаўнікі. Сцены будынка былі падзелены шырокімі лапаткамі, філёнгамі над вокнамі і завершаны карнізамі. Захаваўся ў перабудаваным (2-я пал. XIX – часткова 1-я пал. XX ст.) варыянце.; зменена планіроўка, мансардавы паверх перароблены ў звычайны, замуравана галерэя 1 паверха, зроблены балконы.



Пры перабудове мансарды ў 3-і паверх у пластычным афармленні былі выкарыстаны элементы першых двух паверхаў, што дало магчымасць стварыць адзіную кампазіцыю фасада. Будынак прызначаўся таксама для адкрытых канцэртаў, наз. “музычны флігель”. Пэўны час выкарыстоўваўся як жылы будынак. Зараз у ім размяшчаецца музычная школа.

**Бібліяграфія**


- Багласаў, С.Г. Музычная школа / С.Г. Багласаў, Г.І. Барышаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. /АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 70.
- Габрусь, Т.В. Гродзенская музычная школа / Т.В. Габрусь // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 180.
- Гродзенскай музычнай школы будынак // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск,1993. – С. 166.
- Гродненской музыкальной школы здание // Туристская энциклопедия Беларуси / редкол.: Г.П. Пашков [и др.]; под общ. ред. И.И.Пирожника. – Минск, 2007. – С. 162.
- Трусов, И. "Кривая официна" : призраки Городницы / И. Трусов // Вечерний Гродно. - 2009. - 8 апр. - С. 31.


## Дом-музей Максіма Багдановіча



Дом на вул. Багдановіча,1. Тут у 1892 – 1896 гг. жыў з бацькамі М.А. Багдановіч – выдатны беларускі паэт, празаік, перакладчык і літаратуразнавец. У 1957 г. на доме ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Драўляны дом прамавугольны ў плане, накрыты двухсхільным дахам. Цэнтральны ўваход вырашаны верандай, плоскае пакрыццё якой з’яўляецца тэрасай перад мезанінам, накрытым самастойным двухсхільным дахам. Сцены гарызантальна

ашаляваны, рытмічна расчлянёны прамавугольнымі аконнымі праёмамі ў ліштвах з франтонамі. Вуглы апрацаваны філёнгавымі лапаткамі. У доме знаходзіцца літаратурны музей М.Багдановіча.

**Бібліяграфія**


- Дом, дзе жыў Багдановіч Максім Адамавіч // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 53.
- Міхальчанка А.В. Багдановіч Максім Адамавіч / А.В. Міхальчанка // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Гродна. – Мінск, 2000. – С. 143.
- Таран Л.К. Багдановіч Адам Ягоравіч / Л.К. Таран // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Гродна. – Мінск, 2000. – С. 143.

- Голуб, Ю. Не злічыць у небе ясных зорак, не злічыць у сэрцы светлых дум / Ю.Голуб // Гродзенская праўда. - 2001 - 8 снеж. (№189-190). - С. 12.
- Багдановіч, А.Я. - 140 год з дня нараджэння (1862-1940), этнографа, фальклярыста, мовазнаўца, гісторыка культуры // Дадатак да "Новых кніг". - 2001 - № 11. - С. 14 - 16.
- Памяці Багдановіча // Гродзенская праўда. - 2005. - 4 чэрв. - С. 8.
- Шубіна, Т. Літаратурны музей Максіма Багдановіча / Т. Шубіна // Роднае слова. - 2006. - № 5. - С. 101 - 103.
- Знойдзена магіла дзеда Максіма Багдановіча // Краязнаўчая газета. - 2006. - №20 (май). - С.2.
- Русак, Н. Блукаючы па Максімавых слядах / Н. Русак // Культура. - 2006. - 9 - 15 снеж. - С.14 – 15.
- Асокін, У. У вянок Багдановічу / У. Асокін // Літаратура і мастацтва. - 2006. - 6 кастр. ( №40) . - С. 8.
- Бартохаў, В. Па сцежках Максіма Багдановіча / В. Бартохаў // Літаратура і мастацтва. - 2007. - 23 сак - С. 13.
- Ермашкевіч, Б. "Вянка" узвышаная сіла / Б. Ермашкевіч // Гродзенская праўда. - 2007. - 20 снеж. - С. 4.
- Загідуліна, М. "Апошні скарб свой аддаю..." / М. Загідуліна // Культура. - 2007. - 23 - 29 чэрв. - С. 11.
- Давыдова, К. Непераўзыдзеныя шэдэўры натхнення / К. Давыдова // Настаўніцкая газета. - 2007. - 8 снеж. (№159). - С. 5.
- Бутэвіч, А. Асноўныя вехі жыцця Максіма Багдановіча / А. Бутэвіч // Маладосць. - 2007. - № 10. - С. 95 – 96.
- Давыдова, Е. Возвращение в детство / Е.Давыдова // Вечерний Гродно. -2008. - 5 марта (№10). - С. 6 - 8.
- Адамовіч, Г. Жыццё і творчасць Максіма Багдановіча як прыклад "адарванасці" / Г. Адамовіч // Роднае слова. - 2008. - № 4. - С.3 - 7.

- Кандраценка, К. Паэзія вуліц / К. Кандраценка // Краязнаўчая газета. -2008. - № 35. - С. 5.
- Фоменкова, И. Венок любви / И. Фоменкова // Гродзенская праўда. - 2008. - 6 снеж. - С. 5.
- Гамзович, Р. Зорка Максима Багдановича / Р. Гамзович // Алеся. - 2010. - № 1. - С.16 – 17.
- Байгот, Ж. Две планеты. Одна - в Гродно / Ж. Байгот // Гродзенская праўда. - 2010. - 6 листап. - С. 4.
- На чай к Богдановичам // Вечерний Гродно. - 2010. - 8 дек. – С. 7.
- В музей как в театр : [об экскурсиях с аниматорами в доме-музее М. Богдановича в Гродно] // Вечерний Гродно. - 2011. - 26 янв. - С. 2.
- Ланская, Ж. Пад гукі фісгармоніі / Ж. Ланская // Гродзенская праўда. - 2011. - 5 лют. - С. 5.
- Сиделова, Е. Дом Богдановича / Е. Сиделова // 7 Дней. - 2011. - 24 марта. - С. 16.
- Ланская, Ж. Музей не без друзей / Ж. Ланская // Гродзенская праўда. - 2011. - 2 крас. - С. 3.
- Антонова, А. В гостях у Богдановича / А. Антонова // Гродзенская праўда. - 2011. - 21 мая. - С. 12.
- Антонава, Г. Гродна ў вянку санетаў: пра музей Максіма Багдановіча ў Гродна / А. Антонова // Гродзенская праўда. - 2011. - 3 снеж. - С.4.
- Дзмітрыева, Л. У музейны гродзенскі вянок : [пра выставу "Гродна - калыска паэта" ў музеі Максімама Багдановіча ў Гродна : да 120-годдзя Максіма Багдановіча] / Д. Дзмітрыева // Літаратура і мастацтва. - 2011. - 9 снеж. - С. 18.
- Рапецкая, С. Музей Богдановича станет виртуальным : [беседа с дир. гродн. музея М. Богдановича о проекте "Виртуальное прошлое - залог успеха будущего музеев"] / С. Рапецкая // Гродзенская праўда. . - 2012. - 23 мая. - С. 7.
- Рапецкая, С. "Музей "заплакал" : [беседа с дир. Гродн. дома-музея Масима Богдановича об аварии в системе водоснабжения] / С. Рапецкая // Гродзенская праўда. - 2012. - 6 чэрв. - С.7.
- Рапецкая, С. Люди не хотят жить в музее : [беседа с дир. дома-музея Масима Богдановича об аварии в системе водоснабжения] / С. Рапецкая // Вечерний Гродно. - 2012. - 19 сент. - С. 4.
- Ануфриева, О. Цифровое будущее музея Богдановича : [Евросоюз выделил деньги на обновление музея Масима Богдановича и "начинку" его современной техникой] / О. Ануфриева // Вечерний Гродно. - 2012. - 26 сент. -С. 26.

# Гродзенскі жылы дом (Дом купца Мураўёва)

Помнік архітэктуры мадэрна. Пабудаваны ў 1914 г. у Гродне (суч. вул. Савецкая, 17) як жылы дом купца Мураўёва. У 1919 г. у будынку на працягу трох месяцаў працаваў першы Гродзенскі Савет рабочых дэпутатаў. Трохпавярховы неатынкаваны Г-падобны ў плане будынак. Цэнтральную частку сіметрычнага галоўнага фасада займае вялікі балкон з літой чыгуннай агароджай. На трэцім паверсе крайнія арачныя праёмы з невялікімі балконамі. Плоскасць фасада крапаваная пілястрамі з чыгуннымі вензелямі ў завяршэнні, да ўзроўню 2-га паверха руставаная. У абрысах акон, франтонаў, афармленні бакавых частак галоўнага фасада прасочваюцца рысы стылю мадэрн. Паўкалонкі ў нішах, ліштвы аконных праёмаў, арнамент карнізаў вырашаны ў псеўдарускім стылі. На другім паверсе – вялікая зала, побач з якой заходзіўся пакой для гульняў. Паверхам вышэй размяшчаліся жылыя пакоі, сталовая. У афармленні цэнтральнай залы шырока выкарыстаны дэкаратыўная размалёўка і лепка. Залу асвятляюць 5 вялікіх прамавугольных акон, у двух вуглах – печы з ляпнымі картушамі. Былы пакой для гульняў падзелены на 2 часткі праёмам, акаймаваным драўлянай разной ліштвай.



На столі ляпныя разеткі. У вуглах каміны, абкладзеныя карычневымі кафлянымі пліткамі. У памяшканнях трэцяга паверха захаваліся печы і ляпныя разеткі на столі. Пэўны час у будынку знаходзілася Гродзенская абл. бібліятэка ім. Я.Ф.Карскага. Пасля пераезду бібліятэкі ў Новы замак будынак знаходзіцца на рэстаўрацыі.

## Бібліяграфія


- Пятросава, А.Ю. Гродзенскі жылы дом /А.Ю. Пятросава // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 173.

- Пятросава, А.Ю. Жылы дом / А.Ю. Пятросава, Э.М. Савіцкі // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 54.

- Островцова, И. Отель с печкой. В доме купца Муравьева поселятся туристы / И. Островцова // Вечерний Гродно. - 2006. - 2 авг. - С. 4.
- Островцова, И. Отель блеснет чешуей / И. Островцова // Вечерний Гродно. - 2007. - 24 окт. - С. 2.
- Саласюк, Е. Звезды - дому Муравьева / Е.Саласюк // Гродзенская праўда. - 2007. - 2 мая. - С. 7.
- Шлык, Н. Не по-купечески / Н. Шлык // Гродзенская праўда. - 2010. - 28 лип. - С. 4.
- Шлык, Н. Дом купца. Реконструкции нет конца : [проблемы реконструкции дома купца Муравьева в историч. центре Гродно] / Н. Шлык // Гродзенская праўда. - 2011. - 1 снеж. - С. 1, 2.
- Игнатик, В. Драма дома : [проблемы реконструкции дома купца Муравьева в историч. центре Гродно] / В. Игнатик // Гродзенская праўда. - 2012. - 18 крас. - С. 1, 6.
- Синевич, А. Иллюзорные проекты : [проблемы реконструкции дома купца Муравьева в историч. центре Гродно и др. объектов] / А. Синевич // Вечерний Гродно. - 2012. - 25 июля. - С. 5.
- Шлык, Н. "Ториа" возрождает историю : [о работе ООО "Ториа" по реконструкции дома купца Муравьева в историч. центре Гродно] / Н. Шлык // Гродзенская праўда. - 2012. - 15 жн. - С. 10.
- Вашкевич, А. Дом купца Муравьева : [в рамках проекта "Веч. Гродно" "Красная книга Гродно" по сохранению материалов о зданиях и уголках Гродно, которым грозит исчезновение] // Вечерний Гродно. - 2012. - 24 окт. -С. 30.

## Гродзенскага піваварнага завода будынак



Вул. Маставая на правым беразе Немана. Пабудаваны ў 1877 г. з цэглы. Заводскі комплекс арганізаваны вакол унутранага двара. Рознавялікія аб'ёмы маюць плоскасныя фасады. Прамавугольныя і лучковыя аконныя праёмы дэкарыраваны броўкамі, клінчатымі перамычкамі. Сцены крапаваны лапаткамі, міжпаверхавымі цягам, арнаментам спрошчанага геаметрычнага малюнка. Падвальныя памяшканні перакрыты буйнымі цыліндрычнымі скляпеннямі. Будынак піўзавода

– помнік прамысловага будаўніцтва. Зараз знаходзіцца на рэстаўрацыі, плануецца адкрыццё музея піваварэння.

**Бібліяграфія**


- Кулагін, А.М. Будынак піваварнага завода / А.М. Кулагін // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т астацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 49.

- Шлык, Н.В. Подвальчик на кружку "Горация Геллера" : спроектирован уникальный центр досуга на месте Гродненского пивзавода / Н.В. Шлык // Гродзенская праўда. - 2011. - 28 снеж. - С. 10.
- Вашкевич, А. Заводскя, 2 : история Гродненского пивзавода (в рамках проекта "Веч. Гродно" "Красная книга Гродно" по сохранению материалов о зданиях и уголках Гродно, которым грозит исчезновение) / А. Вашкевич // Вечерний Гродно. - 2012. - 1 авг. - С. 29.
- Шлык, Н. В старых стенах сварят пиво : [о проектах инвестирования в Гродненский пивзавод] / Н.В. Шлык // Гродзенская праўда. . - 2012. - 5 вер. -С. 9.


## Помнік Элізе Ажэшка




На скрыжаванні вуліц Ажэшка і Тэлеграфнай, у скверы. Пастаўлены ў 1929 г. у гарадскім парку. У Вялікую Айчынную вайну жыхары горада збераглі бюст Э. Ажэшка. У 1949 г. пастаўлены на новым месцы, у скверы, непадалёку ад дома, дзе жыла пісьменніца.

Скульптурны партрэт Э.Ажэшка (скульптар Р. Зерых; шэры паліраваны граніт; вышыня бюста 1,1 м., пастамента 2,85 м.). Устаноўлены на складаным па форме шматступенчатым пастаменце. З дэталёвай дакладнасцю перададзены рысы твару пісьменніцы ў сталыя гады яе жыцця: выразна акрэслены падбародак, лёгкая ўсмешка, зморшчынкі каля вачэй. Высокая прычоска, пышна павязаны шаль надаюць вобразу пісьменніцы рамантычнае адценне. На пастаменце надпіс на польскай мове : "Элізе Ажэшка".

**Бібліяграфія**


- Мусіенка, С.П. Пісьменніца з Прынеманскага краю / С.П. Мусіенка // Памяць. гіст.-дакум. хроніка Гродна. – Мінск, 2000. – С. 245.

- Ярмоленка, Г.М. Помнік Ажэшка Элізе / Г.М. Ярмоленка // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. - С. 73.

- Загідуліна, М. Любімая гродзенцамі / М. Загідуліна // Гродзенская праўда. - 2009. - 17 кастр. - С. 5.

## Парк «Румлёва»

Знаходзіцца на паўднева-ўсходняй ускраіне жылога мікрараёна Прынеманскі-2. Створаны ў 2-й палове XIX ст.

Парк пейзажнага тыпу. Размешчаны на высокім плато, абмежаваны з паўночна-ўсходнягя боку левым берагам р.Неман, з паўночна-заходняга – глыбокім ровам. У цэнтры стаяў сядзібны дом (не захаваўся), да якога вяла кляновая алея (захавалася часткова). Яна падзяляе парк на дзве палавіны. У паўночна-заходняй частцы густыя пасадкі дрэў вакол круглай у сячэнні шатровай вежы (узведзена ў 1880 г. з бутавага каменю). У цэнтры паўднёва-ўсходняй часткі вялізная паляна, абкружаная асобнымі курцінамі. Сярод пасадак ліпа, таполя, каштан, вяз, клён, бэз.

Парк – помнік садова-паркавага мастацтва.

**Бібліяграфія**

- Кулагін, А.М. Парк "Румлёва" / А.М. Кулагін // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 73.

- Фоменкова, И. Румлевский лесопарк / И. Фоменкова // Перспектива. - 2006. - 4 апр. - С. 6.
- Мурина, С. Румлево - наша сказка и наша боль / С. Мурина // Гродзенская праўда. - 2007. - 28 лют. - С. 5.
- Семёнова, Е. Сказка и быль Румлёвского леса / Е. Семенова // Гродзенская праўда. - 2007. - 28 лют. (№48). - С. 10.
- Солтан, Т. Горит, горит румлевский парк… / Т. Солтан // Родная прырода. - 2007. - № 4. - С. 14 - 15.
- Синевич, А. Люди и деревья / А. Синевич // Вечерний Гродно. - 2007. - 18 апр. - С. 1,6.
- Синевич, А. Румлево будем спасать вместе / А. Синевич // Вечерний Гродно. - 2007. - 25 апр. - С. 40.
- Рыльская, М. Наша годость и боль – Румлево / М. Рыльская // Гродзенская праўда. - 2007. - 30 мая. - С. 5.
- Раманенка, Л. Па старонках румлёўскай гісторыі / Л. Раманенка // Настаўніцкая газета. - 2007. - 21 крас. - С. 7.

- Романенко, Л. Живи, Румлево, живи! / Л. Романенко // Белорусская нива. - 2007. - 7 апр. - С. 13.
- Мурина, С. Виртуальная тропа реальной гимназии / С. Мурина // Гродзенская праўда. - 2010. - 20 студз. - С. 10, 11.
- Семенова, Е. Виртуальные прогулки по Румлёвскому парку / Е. Семенова // Народная газета. - 2010. - 2 лют. - С. 9.
- Береснева, Е. Какой ландшафт! На брудершафт? / Е. Береснева // Гродзенская праўда. - 2010. - 4 лист. - С. 4 - 5.
- Солтан, Т. Румлево, моя любовь и боль / Т. Солтан // Вечерний Гродно. - 2010. - 10 нояб. - С. 2, 11.
- Мурина, С. Пушистая, но кусачая… / С. Мурина // Гродзенская праўда. - 2010. - 24 лист. - С. 32.
- Соколова, Н. Парк Румлево. Будет образцовым! / Н. Соколова // Гродзенская праўда. - 2010. - 24 лист. - С. 3.
- Румлево : благоустройство или разрушение // Вечерний Гродно. - 2010. - 24 нояб. - С. 7.
- Семенова, Е. Городская отдушина // Народная газета. - 2011. - 26 студз. - С. 12.

## Помнік у гонар воінаў-вызваліцеляў



На пл. Савецкай. Утрыманню Гродна камандаванне нямецка-фашысцкіх войск надавала важнае значэнне. На Гродзенскі напрамак дадаткова былі перакінуты 6 палкоў з Германіі, 50-я пяхотная дывізія і інш. вайсковыя падраздзяленні. У баях за вызваленне горада ўдзельнічалі войскі 31-й арміі (камандуючы генерал-палкоўнік В.В. Глаголеў), 3-га беларускага фронту (камандуючы генерал арміі І.Дз.Чарняхоўскі), падраздзяленні 1-й паветранай арміі (камандуючы генерал-палкоўнік авіяцыі Ц.Ц. Хрукін), часці 50-й арміі (камандуючы генерал-лейтэнант І.В. Болдзін), 2-га Беларускага фронту (камандуючы генерал-палкоўнік Г.Ф. Захараў). Бітва за горад пачалася 13 ліпеня. Праз 2 дні ўпартых баёў воіны 6-й гвардзейскай кавалерыйскай дывізіі (камандуючы генерал-маёр П.П. Брыкель) 15 ліпеня авалодалі старым крапасным фортам, вытрымалі бесперапынныя шматгадзінныя контратакі гітлераўцаў, прарвалі іх баявыя парадкі. Услед за кавалерыстамі ў Гродна ўвайшлі воіны 174-й (палкоўнік М.І. Дзёмін) і 352-й (генерал-маёр М.М. Стрыжэнка) стралковых дывізій 31 арміі. З поўдня выступілі падраздзяленні 42, 35, 29-й стралковых дывізій 50-й арміі. Да раніцы

16 ліпеня горад быў цалкам ачышчаны ад акупантаў. Занеманская частка вызвалена 23. 07. 1944 г. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях за вызваленне Гродна, 17 вайсковым часцям і злучэнням нададзены ганаровыя найменні “Гродзенскіх”.

У 1968 г. у гонар воінаў-вызваліцеляў пастаўлены помнік – танк Т-34.

**Бібліяграфія**


- Савіцкі, Э.М. Помнік у гонар воінаў-вызваліцеляў / Э.М. Савіцкі // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 76.

- Черкес, Т. Тайна номера "200" / Т. Черкес // Вечерний Гродно. - 2009. - 29 апр. - С. 7.
- Межуев, А. Памятник от слова "память" / А.Межуев // Гродзенская праўда. - 2009. - 8 мая. - С. 6.
- Сиводедова, О. История возвращается / О. Сиводедова // Вечерний Гродно. - 2009. - 13 мая. - С. 7.


## Гродзенская сядзіба Панямунь



На ўсходняй ускраіне горада, на правым беразе Немана. Пабудавана ў 1771 г. паводле праекта архітэктара Ю. Аляхновіча, перабудавана ў XIX ст. Была загараднай рэзідэнцыяй караля Станіслава - Аўгуста Панятоўскага.

Палацава-паркавы ансамбль абмежаваны з паўднёвага боку ракой, з усходнягя і паўночнага – глыбокім ровам. Палац і адкрыты перад ім партэр размешчаны ў глыбіні пейзажнага парку, над стромкім берагам, умацаваным падпорнымі сценкамі тэрас. Парк разбіты перад палацам і па схілах рова. Уезд пазначаны капліцай (сярэдзіна XIX ст.) неагатычнага стылю. Гаспадарчыя і службвыя пабудовы былі вынесены за межы параднай часткі ансамбля і пастаўлены з заходняга боку палаца ў адзін рад. Палац аднапавярховы. Спачатку мураваны, пазней частка разбураных сцен заменена драўлянымі. Збярогся фрагмент вуглавой вежы, якая вылучаецца плаўным абрысам, тонкай і складанай прафіліроўкай карнізаў і абрамленняў, здвоенымі пілястрамі і ажурнымі капітэлямі,

гарызантальнай рустоўкай. У цэнтры галоўнага фасада – чатырохкалонная навісь. Дваровы фасад упрыгожаны чатырохкалонным порцікам на высокім цокалі. Перапад у рэльефе забяспечыў дваровому фасаду адкрыццё цокальнага паверха, службовыя памяшканні якога мелі сувязь з памяшканнямі параднага паверха. Планіроўка дома анфіладная з выхадам у цэнтральную вялікую парадную залу.

**Бібліяграфія**


- Кулагін, А. М. Сядзіба [Панямунь] / А.М. Кулагін // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 80.
- Панямоньская сядзіба / Т.В. Габрусь, А. Кулагін, Ю. Чантурыя, А. Квітніцкая, М. Ткачоў // Страчаная спадчына / Т.В.Габрусь, А.М. Кулагін, Ю.У. Чантурыя і інш.; уклад. Габрусь Т.В. – Мінск, 1998. – С. 214.
- Трусов, И.Г. Дворец в Понемуни / И.Г. Трусов // Трусов И.Г. Гродненские пригородные королевские резиденции / Игор Трусов. - Гродно: ООО ЮрСаПринт, 2011. – С. 15 – 19.

Ивановский, В. Тайны Понемуни / В. Ивановский // Вечерний Гродно. – 2002. – 2 - 9 окт. – С. 2.

- Загідуліна, М. Постаць. Да 200-годдзя Напалеона Орды / М. Загідуліна // Гродзенская праўда. - 2007. - 22 лют. - С. 4.
- Трусов, И. Дворец Понемунь. Где в узком кругу отдыхал король Станислав Август Понятовский / И. Трусов // Вечерний Гродно. - 2009. - 5 авг. - С. 29.
- Ушкевич, П. Возрождают королевские хоромы /П. Ушкевич // Перспектива. - 2010. - 5 мая. - С. 28.
- Вашкевич, А. Шляхетские гнезда : наследие городских окрестностей : [шляхетская усадьба в Кашубинцах и др. пригородных усадьбах (в т. ч. Понемунь) в рамках проекта "Вечерний Гродно" "Красная книга Гродно" по сохранению материалов о зданиях и уголках Гродно, которым грозит исчезновение] // Вечерний Гродно. - 2012. - 5 сент. - С. 30.


## Гродзенская сядзіба Станіслава

На паўночна-усходняй ускраіне горада, замыкае вуліцу Ціміразева. Сфарміравана ў 1760 – 1770 гг. паводле праекта італьянскага архітэктара Дж. Сака. Была загараднай рэзідэнцыяй караля Станіслава - Аўгуста Панятоўскага. Цяпер тут адзін з карпусоў Гродзенскага Дзяржаўнага Аграрнага Універсітэта. У планіроўцы ансамбля захаваліся элементы рэгулярнасці. Цэнтральнае месца займае палац,

які знаходзіцца на вяршыні пакатага схілу. Сіметрычна размешчаныя бакавыя флігелі ствараюць парадны курданёр, абнесены з боку ўезда



невысокай цаглянай агароджай. За домам - парк радыяльна-прамянёвай планіроўкі. Гаспадарчыя пабудовы размешчаны за заходнім флігелем.

Мураваны палац – прамавугольны двухпавярховы будынак (першапачаткова аднапавярховы), цэнтральная частка якога аб'ядноўвае парадную групу памяшканняў (вестыбюль, верхнюю і ніжнюю залы). Сярэдзіна галоўнага фасада вылучана рызалітам з філёнгавым фігурным атыкам і тэрасай, цэнтр дваровага фасада – паўкруглым эркерам з манаграмай караля на атыку. Аконныя праёмы дэкарыраваны лучковымі і трхвугольнымі франтонамі, гірляндамі, плоскімі ліштвамі. У дэкоры будынка шырока выкарыстаны раскрапаваныя карнізы, пілястры і паясы. Планіроўка будынка калідорнага тыпу значна зменена. У вестыбюлі захаваліся 2 печы, выкананыя ў стылі неаготыкі, абліцаваныя паліванымі керамічнымі пліткамі цёмна-карычневага колеру (сярэдзіна XIX ст.).

Флігелі – прамавугольныя ў плане аднапавярховыя будынкі пад высокімі чарапічнымі дахамі – меншыя па маштабу, размешчаныя на рэльефе ніжэй за палац, маюць падпарадкаванае значэнне. Помнік сядзібна-паркавай архітэктуры позняга барока.

**Бібліяграфія**


- Кулагін, А.М. Сядзіба [Станіслававa] / А.М. Кулагін // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 80.
- Трусов, И.Г. Станиславово / И.Г. Трусов // Трусов И.Г. Гродненские пригородные королевские резиденции / Игорь Трусов. - Гродно: ООО ЮрСаПринт, 2011. – С. 20 – 27.

- Островцова, И. По следам короля. Дворец в стиле "барокко" ждет реставраторов / И. Островцова // Вечерний Гродно. - 2006. - 18 окт. - С. 4.
- Трусов, И. Код Гродно / И. Трусов // Вечерний Гродно. - 2006. - 3 янв. - С. 26.
- Шлык, Н. О чем мечтал король, прогуливаясь по липовой аллее своей летней резиденции в Станиславово / Н. Шлык // Гродзенская праўда. - 2011. - 27 крас. - С. 10.

- Швед, В. Летняя рэзiдэнцыя караля : пра гродзен. каралеўскую рэзiдэнцыю Станiслава (цяпер вул. Цiмiразева) / В. Швед // Гродзенская праўда. - 2011. - 21 снеж. - С. 8.
- Вашкевич, А. Дворец Станиславово : об одноим. архитектурном памятнике в рамках проекта "Вечерний Гродно" "Красная книга Гродно" по сохранению материалов о зданиях и уголках Гродно, которым грозит исчезновение // Вечерний Гродно. - 2012. - 13 июня. - С. 8.

## Оглавление


Гродзенскія ваенныя могілкі (вул. Белуша) ... 3
Гродзенскія ваенныя могілкі (вул. Перамогі) ... 3
Гродзенская Барысаглебская (Каложская) царква ... 5
Гродзенская кірха ... 11
Гродзенская Свята-Уладзімірская царква ... 13
Гродзенская сінагога ... 14
Гродзенская сядзіба Аўгустова ... 17
Гродзенскія воданапорныя вежы ... 18
Гродзенскія дамы ўрачоў ... 19
Гродзенскія лямусы ... 20
Гродзенскі гарадскі асабняк ... 22
Гродзенскі палац адміністратара ... 23
Гродзенскі дом віцэ-адміністратара ... 24
Гродзенскі дом віцэ-губернатара ... 26
Гродзенскі дом лясной адміністрацыі ... 26
Гродзенскі дом Элізы Ажэшка ... 27
Гродзенскі “домік майстра” ... 30
Гродзенскі касцёл і кляштар бернардынцаў ... 31
Гродзенскі касцёл і кляштар брыгітак ... 35
Гродзенскі касцёл і кляштар іезуітаў ... 37
Гродзенскі касцёл і кляштар францысканцаў ... 43
Гродзенскі народны дом ... 46
Гродзенскі каралеўскі палац (Новы замак) ... 47
Гродзенскі Свята-Раства-Багародзіцкі манастыр ... 49
Гродзенскі Свята-Пакроўскі кафедральны сабор ... 53
Гродзенскі Стары замак ... 56
Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра будынак ... 59
Гродзенскага акруговага шпіталя будынак ... 61
Гродзенскага акруговага суда будынак ... 62
Гродзенскага пазямельна-сялянскага банка будынак ... 63
Гродзенскага паштовага ведамства будынак ... 64
Гродзенскага рэальнага вучылішча будынак ... 65
Гродзенскага тэатра Тызенгауза будынак ... 66
Гродзенскай аптэкі (музея) будынак ... 68
Гродзенскай жаночай гімназіі будынак ... 70
Гродзенскай медычнай школы будынак ... 71
Гродзенскай музычнай школы будынак (крывая афіцына) ... 72
Дом-музей Максіма Багдановіча ... 73
Гродзенскі жылы дом (Дом купца Мураўёва) ... 76
Гродзенскага піваварнага завода будынак ... 77
Помнік Элізе Ажэшка ... 78
Парк «Румлёва» ... 79
Помнік у гонар воінаў-вызваліцеляў ... 80
Гродзенская сядзіба Панямунь ... 81